№ 47 (501) 22 сьнежня 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## Лукашэнка: Не пакідайце мовы нашай беларускай

«Ангельскую мову трэба ведаць, але трэба ведаць і сваю родную мову». **Старонка 2.**

## Дасягнутыя нейкія дамоўленасьці

Вынікі сустрэчы Пуціна й Лукашэнкі ў Маскве. **Старонка 6.**

## Румынія абвесьціла камунізм злачынным

Прэзыдэнт Басэску перапрасіў усіх ахвяраў. **Старонка 24.**

## Бэльгіі больш не існуе. Кароль пакінуў краіну

Бэльгійцы перажылі сапраўдны шок пасьля таго, як па ТВ ім паведамілі пра распад краіны. **Старонка 7.**

## Фатальны шлях санкцыяў

Канада першай увяла эканамічныя санкцыі супраць Беларусі. За прыгожыя жэсты прыходзіцца плаціць катастрафічную цану. Піша Сяргей Богдан. **Старонка 8.**

# Атэізм вяртаецца?




**Кіраўнік ідэалягічнай вэртыкалі: «Узмацненьне ўплыву рэлігіі азначае адначасова аслабленьне ўплыву дзяржаўнай ідэалёгіі. Добра, што сёньня на чале праваслаўнай царквы стаіць выключна мудры чалавек. Але кадравыя перастаноўкі з часам непазьбежныя, і дзе гарантыя, што заўтра сытуацыя ня зьменіцца?» Старонка 3.**

# У нумары




**Першае выданьне з сэрыі «Кнігарня «НН» .............................. 27**

## люстра дзён

«Советская Белоруссия»: «Урад пачне пошукі новых крыніцаў бюджэту» ........ 6

Актуальныя левыя .................................... 10

Навуменка спачыў на Кальварыі .......... 14

Зьняты рэдактар «Роднага слова»....... 15

Мірон павесіў бел-чырвона-белы сьцяг каля будынку КДБ .................................. 15

Салігорскія шахцёры падарылі «НН» талерку ......................................................... 15

## з усіх старон

Гэткім злачынствам няма тэрміну даўнасьці ...................................................... 24

## камэнтары

Віталь Тарас. Цёплая зіма 2006-га ..... 12

Аляксандар Класкоўскі. Мы ўсё ж прачнемся ў іншай краіне ....................... 16

Павал Севярынец. Дом ля пагосту..... 18

## левым вокам

Лёлік Ушкін. Ніколі не кажы «Белтрансгаз» ............................................ 17

## Калядны нумар «НН»

29 сьнежня на 48 старонках.

Глядзім **здымкі году**,

вызначаем **асобаў году**,

падсумоўваем **вынікі году**,

робім **высновы з году** — і на вакацыі!

Зь сямю **каляднымі апавяданьнямі** на сем калядных вечароў.

### 50 РАДКОЎ РЭДАКТАРА

# Як тут верыць

Тыдзень быў ідэальным для віртуальных падарожжаў у краіну дэфіцытаў — СССР. Спрыяла стагодзьдзе Леаніда Брэжнева (пра яго піша Віталь Тарас **на старонцы 11**), які для большыні жывых гэты СССР увасабляе, і шквал прысьвечаных яму тэлеперадачаў і публікацыяў. З агульным тонам «ня ўсё толькі дрэннае зьвязана з...». Прычым з памяці неяк выпадае, што чатыры зоркі Героя Савецкага Саюзу і анэкдоты пра «сіські-масіські» даваліся ў комплексе з аўганскай вайной і дэфіцытам. Дзякуй ідэолягу Анатолю Рубінаву: дадаў паўнаты настальгічным адчуваньням, заклікаўшы назад у савецкі атэізм **(старонка 3).**

Апошні «сур'ёзны» тыдзень году — спрэс парадоксы. У тонкія моманты гісторыі добра відаць цана прапаганды — міністэрскіх заяваў, што бюджэт краіны як быў пры цане на газ у 46 даляраў за куб, такі й застанецца. Эўразьвяз сымбалічна ўводзіць санкцыі з нагоды парушэньня правоў працоўных **(старонка 7)**, — і дзяржбясьпека абвяшчае пра падрыхтоўку дзяржаўнага перавароту падчас мясцовых выбараў. «Афіцыйныя» пісьменьнікі афіцыйна не прыходзяць на пахаваньне аднаго з апошніх Народных **(старонка 14)**, — а кіраўнік дзяржавы ледзь не цытуе Багушэвічавы словы пра мову беларускую. Як тут верыць?

Як верыць, калі беларускія газэты па-ранейшаму ў напаўпадпольлі? І па-ранейшаму «Наша Ніва» ня выстаіць бяз Вашых ахвяраваньняў. Просім кожную сям'ю нашых чытачоў да 30 сьнежня пераказаць нам ахвяраваньні на выхад газэты. Хто ахвяруе 8000 рублёў, той забясьпечыць выхад газэты на месяц. Хто дашле 24000, той гарантуе наш друк на квартал. Хто 48000 — той ахвяруе на паўгоду. Банкаўскія рэквізыты вы знойдзеце на старонцы 30. Не забывайцеся пазначаць у блянку: «Ахвяраваньні». Толькі на сябе можам разьлічваць.

**Андрэй Скурко**

### КАМЭНТАР

# Кракадзілавы сьлёзы

Сустракаючыся з рэктарамі, Аляксандар Лукашэнка між словам заявіў: ненармальная сытуацыя, калі ў асобных гімназіях практыкуюць адзін урок беларускай мовы ў тыдзень і шэсьць урокаў ангельскай. «Ангельскую мову трэба ведаць, але трэба ведаць і сваю родную мову», — дадаў ён.

Ён забыўся сказаць, што «адзін урок беларускай мовы» — вынік мэтанакіраванай палітыкі, якая праводзілася дванаццаць гадоў. Былі адмененыя адна за адной усе правы мовы. Найлепшым беларускамоўным музыкам забаронена выступаць, імёны найлепшых беларускамоўных пісьменьнікаў забаронена ўзгадваць на ТВ. «Сэнатар» называе ўблюдкамі школьнікаў, якія наважыліся ўзьняць голас у абарону выкладаньня гісторыі Беларусі па-беларуску, і застаецца пры гэтым давераным сябром прэзыдэнта. Забараніўшы незалежнае радыё і ТВ на мове, ідэолягі ганяюцца зь пятлёю за апошнімі газэтамі й часопісамі. У лукашэнкаўскай Беларусі зачынена болей беларускамоўных СМІ, чым за ўсю папярэднюю гісторыю краіны, з царскімі і санацыйнымі часамі ўключна! Пра такую «драбязу», як спыненьне дубляжу мультфільмаў на мове, у гэтым пераліку і ўспамінаць сорамна. Мультыкі перакладае толькі клятая-праклятая «апазыцыя». І пасьля гэтага шукаць вінаватых у тым, што дзеці не разумеюць маўленьня і чытаць па-беларуску ня ўмеюць?..

Беларуская мова тады стане роўнаю між роўных, калі на ёй стануць гаварыць прэзыдэнт і міністры. Пакуль жа беларускамоўных забаронена прымаць на дзяржаўную службу, пакуль у краіне падтрымоўваецца культурны апартэід, такія заявы выклікаюць толькі.

**Барыс Тумар**

# Атэізм вяртаецца як дзяржаўная ідэалёгія

У аўторак, 12 сьнежня, у газэце «Советская Белоруссия» быў зьмешчаны чарговы праграмны артыкул намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Анатоля Рубінава «Навука і грамадзтва», які заняў ажно дзьве старонкі. Спадар Рубінаў піша, якім ён бачыць месца навукі ў беларускай ідэалёгіі, асуджае рэлігію, паказвае матэрыялізм і атэізм як адзіна правільны пункт гледжаньня, абгрунтоўвае неабходнасьць антырэлігійнай прапаганды і зьніжэньня ўплыву царквы на грамадзтва.

Улада дае зразумець, што больш не зьбіраецца гуляцца з апошнім вольным асяродкам — рэлігійнымі арганізацыямі. Прылюднае выказваньне Лукашэнкі на гэтую тэму па тэлебачаньні выклікала б незадаволенасьць у грамадзтве, таму ўлады выкарысталі такі вось спосаб недвухсэнсоўнага ўказаньня ідэалягічнай вэртыкалі.

У прыватнасьці, у матэрыяле адзначаецца: «На зьмену (камуністычнай ідэалёгіі), як палачкі-выручалачкі, аўтаматычна прыйшлі шматразова выпрабаваныя гісторыяй старыя ідэалягічныя прынцыпы: нацыяналізм і рэлігія». Спадар Рубінаў крытыкуе тых, хто не прызнае матэрыялізму ды атэізму і верыць у Бога. «Залішняя актыўнасьць царквы, імкненьне пранікнуць у сярэднюю і вышэйшую адукацыю выклікаюць заклапочанасьць. Усё-такі дамінаваць у нас павінна сьвецкая адукацыя і выхаваньне, заснаванае на матэрыялістычным сьветапоглядзе. Інакш адукацыйны і творчы статус нашага грамадзтва будзе зьніжацца», — працягвае свае думкі сп. Рубінаў.



**Акадэмік Анатоль Рубінаў, галоўны ідэоляг краіны.**

Калі уважліва прачытаць артыкул, то можна ўбачыць, чаму так не падабаецца рэлігія аўтару і тым, на чый заказ напісаны матэрыял: «Нарэшце, узмацненьне ўплыву рэлігіі азначае адначасова аслабленьне ўплыву дзяржаўнай ідэалёгіі. Добра, што сёньня на чале праваслаўнай царквы стаіць выключна мудры чалавек, ня толькі выбітны рэлігійны дзяяч, але і вялікі, адказны палітык, які шчыра клапоціцца аб росквіце нашай краіны. Але кадравыя перастаноўкі з часам непазьбежныя, і дзе гарантыя, што заўтра сытуацыя ня зьменіцца? І дзяржаве ўжо будзе цяжка перацягваць на свой бок тых, хто трапіў пад уплыў царквы». Усё становіцца зразумела. Уладзе ня трэба людзі з хрысьціянскім сьветапоглядам, для якіх найвышэйшымі маральнымі каштоўнасьцямі зьяўляюцца любоў, праўда, справядлівасьць. «Дзяржава», як і савецкая, разглядае сама сябе як першакрыніцу ўлады, а царкву — як канкуруючую структуру. Асабліва напалохалі ідэолягаў, трэба думаць, нядаўнія выступы пратэстантаў і каталікоў у абарону сваіх правоў, якія не ўдалося прыдушыць.

Далей сп. Рубінаў піша пра тое, якія меры трэба прымаць супраць гэтага (можа быць, што праграма тых захадаў ужо ўзгоднена). Ён піша пра неабходнасьць узмацненьня навукова-тэхнічнай прапаганды, асьветніцкай працы ў СМІ, аднаўленьня актыўнай працы таварыства «Веды», супрацьдзеяньня распаўсюду ў грамадзтве забабонаў.

Варта чакаць уціску рэлігійных арганізацый, асабліва тых, якія ня маюць «мудрага пастыра», ды разгортваньня антыклерыкальнай прапаганды. Атэізм вяртаецца.

**Янка Зуброўскі**

## Мітрапаліт запатрабаваў тлумачэньняў

Прэс-служба Беларускага Экзархату паведаміла, што 15 сьнежня ў Адміністрацыю прэзыдэнта накіраваны ліст Мітрапаліта Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, з просьбай пракамэнтаваць артыкул акадэміка Анатоля Рубінава. У ім, паводле меркаваньня Мітрапаліта, утрымліваюцца «некарэктныя выказваньні і абразьлівыя для вернікаў палажэньні».

**Матэрыял «Атэізм вяртаецца як дзяржаўная ідэалёгія» стаў самым папулярным матэрыялам на сайце nn.by за мінулы тыдзень. Яго прачыталі 1114 чалавек. Ён выклікаў буру водгукаў. Падаём некаторыя зь іх.**

**Марыман напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 12:38**

Правільна, не хапала нам яшчэ хрысьціянскага фундамэнталізму. Дураць гэтыя барадатыя з крыжамі народу галаву.

**С.П. напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 13:46**

Я таксама лічу, што царква павінна быць катэгарычна аддзеленая ад дзяржавы, ад школы і ўсяго астатняга. Свабода веравызнаньня свабодай веравызнаньня, але дзяржава мусіць прапагандаваць навуковы сьветапогляд. Менавіта гэтага нашай дзяржаўнай ідэалёгіі і не хапала, таму, калі гэта зьявіцца, стане толькі лепш. Гэта зробіць яе больш пасьлядоўнай і менш эклектычнай. А то колькі можна ўжо засільля ня толькі служак культу, але ж яшчэ і ўсялякіх астролягаў, хірамантаў, «народных лекараў» і да т.п.?

**Пан Навараціла напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 14:02**

А колькі можна ўжо засільля служак культу Атэізму, Алькагалізму?.. Ад школы аддзеленая? А калі я за гэта хачу плаціць са сваіх грошаў? Вы мне забароніце?

**sergik напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 15:05**

Мне шкада спадара Рубінава і ўсіх, каго ён абслугоўвае, бо іхнае жыцьцё ня мае ніякага сэнсу і значэньня. А хрысьціянства дае надзею ўсім!

**Alaksiej напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 16:12**

Ну так, возьмем, для прыкладу, Мальту ці Польшчу. Там вера мае вялікі ўплыў на людзей. І што, яны надалей у Сярэднявеччы? Дарэчы, ці ня ў «цёмным» Сярэднявеччы паўсталі найвыдатнейшыя ўнівэрсытэты?

**Андрэй напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 16:18**

Калі гэта прывядзе да таго, што са школьнай праграмы скасуюць асновы праваслаўя, тады я — «за». У мяне дзіцё падрастае, і мяне проста жах бярэ, калі падумаеш, што яму хутка ў

**Працяг на старонцы 9.**

# Улады стаміліся гуляць у дэмакратыю

Мясцовыя выбары бяз выбару: 97% акругаў безальтэрнатыўныя. Імітацыя альтэрнатыўнасьці працягваецца толькі ў вялікіх гарадах. Незалежнае грамадзтва перастала спадзявацца на выбары: лічба зарэгістраваных кандыдатаў ад апазыцыі ўтрая меншая, чым у 2003 г. Хаду кампаніі аналізуе **Зьміцер Панкавец**.

15 сьнежня ЦВК падвёў вынікі рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў. У краіне на 22 658 выбарчых акругаў зарэгістраваны 23 791 кандыдат. Такім чынам, конкурс на дэпутацкі мандат складае 1,05 кандыдата на месца, або 97% акругаў будуць безальтэрнатыўнымі (у шэрагу акругаў у вялікіх гарадах на адно месца прэтэндуюць тры-чатыры кандыдаты).

Савецкая безальтэрнатыўнасьць вярнулася на выбары ў сельскія саветы. На 16 443 мандаты будзе прэтэндаваць 16 675 кандыдатаў.

Сьледам за іншымі савецкімі завядзёнкамі ў краіну вяртаецца герантакратыя. Толькі 7% зарэгістраваных кандытаў маладзейшыя за 30 гадоў.

З 245 зарэгістраваных ініцыятыўных групаў кандыдатаў ад ПКБ пасьля рэгістрацыі барацьбу працягваюць толькі 50 актывістаў партыі. На апошнім зьезьдзе ПКБ была прынятая рэкамэндацыя аб няўдзеле ў выбарах, таму большасьць камуністаў зьнялі свае кандыдатуры. Некаторыя пакінулі свае кандыдатуры «дзеля экспэрымэнту».

Каля 130 чалавек вылучаныя ад БНФ.

АГП змагло зарэгістраваць блізу 60 кандыдатаў.

Лічбы па БСДП (Грамада) пакуль да канца невядомыя.

У 2003 г. дэмакратычная кааліцыя зарэгістравала каля тысячы сваіх кандыдатаў, зь іх дэпутатамі рознага ўзроўню сталі 100 чалавек. Сёлета дасягнуць такога посьпеху будзе немагчыма.

Калі ўлічыць, што вялікую долю альтэрнатыўных звычайна адсейваюць на этапе кампаніі, іх застанецца яшчэ менш.

Ня выключана, што прадстаўнікі Дэмакратычных сілаў здымуць свае кандыдатуры перад выбарамі, як гэта ўжо зрабілі камуністы.

Ва ўмовах, калі выбарчыя камісіі складзеныя з прадстаўнікоў ідэалягічнай вэртыкалі, падлік галасоў ня мае сэнсу, мяркуюць яны, і выбары варта скарыстоўваць толькі для агітацыі.

## Магілёўшчына: Чыгіра зарэзалі

«Па Магілёўшчыне агулам зарэгістравана каля 35 дэмакратычных кандыдатаў», — расказвае журналіст Алесь Асіпцоў. Сярод найбольш характэрных «зарэзаных» прэтэндэнтаў папулярныя сярод людзей дэпутат бабруйскага гарсавету, настаўнік Алесь Чыгір і лідэр магілёўскай філіі незарэгістраванай Партыі свабоды і прагрэсу Аляксандар Сілкоў.

Сярод зарэгістраваных — кіраўнік Магілёўскай абласной арганізацыі БНФ Рыгор Кастусёў, Уладзімер Шанцаў з АГП, прафсаюзны актывіст з Бабруйску Міхаіл Кавалькоў, Сяргей Стральцоў (АГП), былы дырэктар саўгасу «Дрыбінскі» Мікалай Юркоў.

Сярод гарадоў Магілёўшчыны, дзе дэмакратычных кандыдатаў рэгістравалі — Магілёў, Бабруйск, Горкі, Шклоў, Асіповічы, Дрыбін. Гэта красамоўны сьпіс. У гэтых гарадах улады лічаць, што нерэгістрацыя альтэрнатыўных кандыдатаў нявыгадная для рэпутацыі існуючага ладу. Выбарцы тут яшчэ не дасьпелі, каб прыняць безальтэрнатыўнасьць выбараў.

## Гарадзеншчына: адмовілі Чырвоненку і Мальчыку

У Горадні ў рэгістрацыі адмовілі намесьніку старшыні суполкі АГП Уладзімеру Чырвоненку і кіраўніку гарадзенскай абласной арганізацыі БНФ Сяргею Мальчыку. Затое рэгістрацыю атрымаў дэпутат Гарадзенскага гарсавету мінулага скліканьня прафсаюзу, правадыр Сяргей Антусевіч.

Сярод іншых зарэгістраваных дэмакратаў — Андрэй Фралоў, Дзяніс Івашын, Валер Кісель.

## Берасьцейшчына: безальтэрнатыўныя Баранавічы

У Берасьцейскай вобласьці рэгістрацыю прайшлі каля 50 дэмакратаў. 32 чалавекі зарэгістравана ад БНФ, каля 13 ад БСДП (Грамада), па некалькі кандыдатаў прадстаўляюць АГП і ПКБ. Безь ніводнага дэмакратычнага кандыдата засталіся 170-тысячныя Баранавічы, дзе пазыцыі нацыянальных і дэмакратычных сілаў асабліва моцныя.

«Напачатку на выбары ішлі 8 чалавек ад апазыцыі, але з розных прычынаў усе былі зьнятыя, — кажа журналіст баранавіцкай газэты «Intex-press» Руслан Гарбачоў. — «Пэкэбоўцы» самі зьнялі свае кандыдатуры яшчэ да рэгістрацыі, іншым адмовілі з надуманых прычынаў кшталту непададзенага ў дэклярацыю машыннага прычэпу ці нечага яшчэ. Усяго на 36 баранавіцкіх акругаў зарэгістраваныя 37 кандыдатаў. Выбары ў нашым горадзе будуць абсалютна безальтэрнатыўнымі. Сярод прэтэндэнтаў найболей настаўнікаў і мэдыкаў».

У іншых гарадах вобласьці адмоваў няшмат.

Толькі дэпутату маларыцкага райсавету Ўладзімеру Малею адмовілі ў рэгістрацыі дэпутатам у райсавет, але далі рэгістрацыю на больш складаныя выбары ў абласавет, дзе вялікая акруга, якую пры абмежаваньнях выбарчага заканадаўства немагчыма ахапіць агітацыяй. Прайшлі рэгістрацыю Сьцяпан Навасельчан (АГП), прафэсар Іван Акінчыц (ПКБ), Юрась Губарэвіч (ПБНФ). Альтэрнатыўныя кандыдаты будуць на выбарах у Берасьці, Століне, Лунінцы, Пінску, Дарагічыне, Бярозе, Кобрыне, Маларыце, Івацэвічах.

У першым туры мінулых мясцовых выбараў у Белаазерску большасьць месцаў у гарсавеце ўзялі дэмакратычныя кандыдаты на чале з папулярным франтаўцам Юрасём Губарэвічам. Цяпер гэта ня будзе магчыма, бо ў горадзе зарэгістраваныя толькі чатыры апазыцыянэры. Юрась Губарэвіч кажа: «У Белаазерску на кожнай акрузе будзе па два прэтэндэнты, таму цяжка сказаць, хто менавіта будзе кандыдатам уладам. Па адной акрузе ідуць, напрыклад, манцёр і сьлесар, ці намесьнікі дырэктароў розных прадпрыемстваў».

## Віцебск зачышчаны

Безальтэрнатыўнымі будуць выбары і ў Віцебску. Выбарчыя камісіі «зарэзалі» ў Віцебску кіраўніка віцебскага абласнога штабу Аляксандра Мілінкевіча Хрыстафора Жаляпава, бацьку палітвязьня Кастуся Севярынца, Аляксея Гаўруцікава (БСДП (Грамада)), Уладзіслава Токарава (ПБНФ). Старшыня рады Віцебскай абласной арганізацыі Партыі БНФ Кастусь Смолікаў быў

зарэгістраваны толькі на выбарах у аблсавет. Зачэпкай для нерэгістрацыі зьяўляюцца нібыта несапраўдныя подпісы. Даказаць праўду вельмі складана.

Хрыстафор Жаляпаў гаворыць, што будзе праз суд дамагацца сваёй рэгістрацыі. «Выбарчым камісіям дастаткова знайсьці пяць несапраўдных подпісаў, каб скасаваць рэгістрацыю. Трэба адзначыць таксама, што ніхто не паказвае, дзе менавіта былі дапушчаныя памылкі. Кажуць проста, што знайшлі столькі й столькі несапраўдных подпісаў».

Усяго па Віцебшчыне атрымалі рэгістрацыю 24 чалавекі з дэмакратычнай кааліцыі. Сярод іх настаўніца-франтаўка Лера Сом (Полацак), Яраслаў Берніковіч (Глыбокае), выгнаны з працы дырэктар школы Леанід Гаравы (Гарадок), Алесь Шутаў (Ворша), Ганна Леўчанкава (Барань), камуніст Мікалай Петрушэнка (Коханава).

Таксама незалежныя кандыдаты будуць у выбарчых сьпісах Наваполацку, Верхнядзьвінску, Мёраў. У Паставах у рэгістрацыі адмовілі краязнаўцу Міхасю Гілю.

## Гомельшчына: адзіны пазьняковец

Дэмакратычных кандыдатаў па Гомельшчыне было зарэгістравана ўсяго 26 чалавек. Гэта прадстаўнікі АГП — 16 чалавек, ПБНФ — 6, ПКБ — 3, КХП-БНФ — 1. Нягледзячы на тое, што партыя вырашыла байкатаваць мясцовыя выбары ў Гомелі, быў зарэгістраваны прадстаўнік КХП-БНФ Уладзімер Шыцікаў. Усяго шэсьць апазыцыянэраў будуць прэтэндаваць на месца ў Гомельскі гарсавет. Не зарэгістравалі вядомых у сваім горадзе Ўладзімера Кацору, Галіну Скараход, Аляксандра Касьцючэнку.

Таксама дэмакраты будуць у сьпісах выбарцаў Жлобіна, Мазыра, Калінкавічаў, Буда-Кашалёва, Добруша, Веткі. Часьцей у гэтых гарадох зарэгістравана па адным дэмакраце.

## Менск: востраў кіраванае дэмакратыі

Толькі ў сталіцы ўлады палічылі патрэбным гуляць у дэмакратыю. У сталіцы на 55 акругаў зарэгістравалі 168 кандыдатаў, у тым ліку праваабаронцу Алега Воўчака, намесьніка старшыні Партыі БНФ Алеся Міхалевіча, Алеся Стральцова з Грамады, старшыню АГП Анатоля Лябедзьку, ягонага сына Арцёма, а таксама старшыню ПБНФ Вінцука Вячорку. Рэгістрацыю не прайшоў генэрал Фралоў.

Аднак пры гэтым ні ў адну выбарчую камісію ня трапіў незалежны вылучэнец. Яны складаюцца цалкам з стаўленікаў ідэалягічнае вэртыкалі. Таму падлік галасоў будуць ажыцьцяўляць, фактычна, прадстаўнікі пэўных кандыдатаў.

## Меншчына: Салаш зьняўся

На Меншчыне зарэгістравана каля трох дзясяткаў незалежных кандыдатаў у дэпутаты. Дэмакраты ідуць у Вузьдзе, Слуцку, Пухавічах, Жодзіне, Барысаве. Праўда, самы яркі лідэр апазыцыі з Барысава Сяргей Салаш і яшчэ тры апазыцыйныя актывісты адмовіліся ад рэгістрацыі, пратэстуючы супраць грубага парушэньня выбарчага заканадаўства.

У Салігорску мясцовыя выбарчыя камісіі адмовілі з надуманых прычынаў у рэгістрацыі амаль усім дэмакратам. Незарэгістраваныя Павал Батуеў, Аляксей Валабуеў.

У Вялейцы бар'ер рэгістрацыі пераадолелі шасьцёра актывістаў.




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Пісьменьнік Іван Навуменка спачыў на Кальварыі

Яго пахавалі ў аўторак.

Адышоў ад нас народны пісьменьнік Беларусі Іван Навуменка. Народжаны ў Васілевічах у 1925 годзе, ён стаў вядомы сваёй ваеннай прозай. Ён быў таксама плённым і заслужаным літаратуразнаўцам. Характэрны літаратар савецкай школы, ён цяжка перажываў злом камуністычнага ладу, постсавецкае бурапеньне і падзеньне грамадзкага прэстыжу пісьменьніцкае працы, ды так і ня здолеў упісацца ў новы час.

Пахаваньне адбылося ў аўторак, а 13-й, на менскіх Кальварыйскіх могілках.

Іван Навуменка быў адзіным з народных пісьменьнікаў Беларусі, званьне якому прысудзіў А.Лукашэнка. Гэта адбылося на самым пачатку 1995 году, калі беларуская інтэлігенцыя яшчэ ня стала аб'ектам ідэалягічнага цкаваньня. У 2005–2006-м стары ўжо і сьмяротна хворы творца рашуча адмовіўся падтрымаць стварэньне пралукашэнкаўскага Саюзу пісьменьнікаў нумар два на чале з Чаргінцом, даслаўшы апошняму гнеўны і зьедлівы ліст.

Зямля пухам майстру беларускага слова.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Іван Навуменка**

**прыйшоў на сьвет 16 лютага 1925 г. у Васілевічах, сёньня Рэчыцкі раён Гомельскай вобл. Скончыў БДУ (1950), доктар філялягічных навук (1969), прафэсар (1971). З 1972 г. — дырэктар Інстытуту літаратуры імя Янкі Купалы. З 1992 г. — дарадца пры прэзыдыюме Акадэміі навук Беларусі.**

**Друкаваўся з 1955 г. Першы зборнік апавяданьняў — «Сямнаццатай вясной», аўтар аповесьцяў «Сьнежань», «Мой сябар Пятрусь», «Бульба», «У бары на сьвітаньні», раманаў «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці».**

**Іван Навуменка быў аўтарам літаратуразнаўчых манаграфій пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Зьмітрака Бядулю, Максіма Багдановіча, Кузьму Чорнага.**

## Разьвітаньне з Народным

Дом на Маркса, 36, насупраць Адміністрацыі прэзыдэнта, быў першым «пісьменьніцкім домам» у Менску. Тут жылі Уладзімер Караткевіч, Вячаслаў Адамчык, Іван Шамякін. 19 сьнежня ў гэтым доме разьвіталіся з народным пісьменьнікам Беларусі Іванам Навуменкам. Ён быў апошнім зь пісьменьнікаў, хто жыў у гэтым доме ад моманту яго засяленьня.

Разьвітацца з Навуменкам прыйшло каля 250 чалавек. Да кватэры пісьменьніка, што месьціцца на чацьвёртым паверсе, утварылася жывая людзкая чарга ад першых паверхаў. Амаль усе несьлі кветкі. Было багата моладзі зь бел-чырвона-белымі значкамі і значкамі «За Свабоду» на вопратцы.

Праводзіць свайго калегу ў апошні шлях сабраліся практычна ўсе пісьменьнікі старэйшага пакаленьня. Паэт Анатоль Вярцінскі расказвае, што ягонае і Навуменкава лецішча былі побач: «Іван заўсёды заставаўся вяскоўцам. Ён любіў па-сялянску аглядаць палеткі, глебу, любіў хадзіць гуляць у лес. У гэтым і была сутнасьць ягонай вясковая натуры, спосаб жыцьця. Сёньня я магу сказаць толькі апошняе «бывай» і апошняе «даруй». Ля труны стаялі Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Валянцін Тарас.

Леанід Дранько-Майсюк называе сябе адным з тых пісьменьнікаў, хто прыйшоў у літаратуру ў тым ліку дзякуючы творчасьці І.Навуменкі. «Я ўспамінаю, як у 1970 годзе па радыё пачуў, што Іван Навуменка скончыў працу над новым раманам «Сорак трэці», і вельмі ўзрадаваўся. Бо ўжо быў раней знаёмы з творчасьцю Івана Якаўлевіча. Узгадваю, наколькі зачытанымі былі яго кніжкі ў давыдгарадоцкай бібліятэцы. Для мяне і сёньня раман «Вецер у соснах» зьяўляецца адным з найбольш знакавых у беларускай літаратуры». Менавіта Дранько-Майсюк нёс крыж.

На разьвітаньні не было прадстаўнікоў афіцыйнага Саюзу пісьменьнікаў. А.Вярцінскі кажа, што прыйсьці сюды Чаргінец папросту ня мог з маральных і этычных меркаваньняў пасьля ягоных сумнавядомых заяваў пра стан здароўя Навуменкі.

Аляксандар Вайтовіч быў адзіным палітыкам, хто прыйшоў на разьвітаньне. «Зь Іванам Навуменкам я пазнаёміўся падчас свайго прэзыдэнцтва ў Акадэміі навук, тады Навуменка ўваходзіў у склад прэзыдыюму, і мы часта кантактавалі. У мяне засталіся вельмі добрыя ўражаньні ад гэтага знаёмства, таму лічу сваім абавязкам прыйсьці на пахаваньне», — сказаў А.Вайтовіч.

Віктар Жыбуль, прадстаўнік маладзейшага пакаленьня пісьменьнікаў, сказаў, што прыйшоў, каб выказаць сваю павагу і пашану Народнаму пісьменьніку. «Што б ні казалі, але проста так гэтае званьне ніколі нікому не давалі. Гэта быў сапраўды добры пісьменьнік».

Труна Івана Навуменкі не была накрытая ні бел-чырвона-белым, ні чырвона-зялёным сьцягам. Труну з Навуменкам паклалі ў маленькі мікраааўтобус. Для жадаючых трапіць на пахаваньне былі падрыхтаваныя два аўтобусы. Ніхто не перакрываў праспэкт, як падчас пахаваньня Быкава.

Побач з домам праехала машына здымачнай групы БТ, што вярталася зь нейкага іншага заданьня. Дзяржаўныя мас-мэдыі не прысутнічалі на разьвітаньні з адзіным у краіне пісьменьнікам, званьне народнага якому надаў Аляксандар Лукашэнка. Навуменка так і ня стаў сваім для сёньняшніх уладаў.

Народнага пісьменьніка Беларусі Івана Навуменку пахавалі, як ён і хацеў, на Кальварыйскіх могілках, побач з жонкай.

**Зьміцер Панкавец**

# Бэльгіі больш не існуе. Кароль пакінуў краіну

Жыхары Бельгіі перажылі сапраўдны шок пасьля таго, як па дзяржаўным тэлебачаньні ім паведамілі пра распад краіны.

Тое, што гэта розыгрыш, зразумелі ня ўсе й далёка не адразу.

Дзяржаўны тэлеканал РТБФ у сераду вечарам аб’явіў пра тое, што парлямэнт Фляндрыі прагаласаваў за адлучэньне гэтага флямандзкамоўнага рэгіёну ад Каралеўства Бэльгія, што Бэльгіі болей не існуе, а кароль на вайсковым самалёце пакінуў краіну. Журналісты перадавалі гэтую «навіну» з-пад каралеўскага палацу. Праз пэўны час пайшлі іншыя жывыя ўключэньні: з-пад палацу «Атоміюм», дзе, нібыта, схаваліся бэльгійскія палітыкі, верныя адзінству краіны, з часовых пунктаў пропуску, нібыта абладжаных флямандзкай вартай на мяжы франкамоўных і флямандзкамоўных кварталаў сталіцы, інфармацыя пра перакрыцьцё трамвайных маршрутаў на гэтай новай мяжы... Гэтая навіна перапалохала ня толькі Бэльгію, але і суседнія краіны. Толькі праз пэўны час выпускі «навінаў» пачалі суправаджацца бесьперапынным рухомым радком. У ім тлумачылася, што ўсё гэта толькі журналісцкая выдумка. Праўда, набраны ён быў настолькі дробным шрыфтам, а журналісты і вядоўцы былі настолькі сур’ёзныя, што многія гледачы працягвалі прымаць гэтую сэнсацыйную навіну за шчырую праўду. Апроч таго, праўдападобнасьці гэтым паведамленьням дадавалі так званыя «жывыя» ўключэньні, у якіх свае камэнтары з нагоды расколу краіны давалі вядомыя ў Бэльгіі палітыкі й грамадзкія дзеячы.




Во так можа падзяліцца Бэльгія.




Кадр з скандальнага рэпартажу РТБФ.

Паводле словаў прадстаўнікоў тэлеканалу, гэты праект меў ня толькі жартаўлівыя мэты. Ён быў старанна прадуманы і рыхтаваўся ў таямніцы два месяцы. Яны намагаліся прадэманстраваць усе нэгатыўныя наступствы магчымага падзелу Бэльгіі на Фляндрыю й Валёнію. Сам па сабе такі сцэнар абмяркоўваюць у гэтай краіне ўжо даволі даўно.

Гэтая праграма выклікала бурную рэакцыю афіцыйнага кіраўніцтва – прэм’ер-міністар Бэльгіі ў афіцыйнай заяве назваў праграму й ейных аўтараў «абсалютна безадказнымі». Міністарка інфармацыі заявіла, што СМІ ў дадзеным выпадку парушыла журналісцкую этыку. Што цікава, ніхто не гаворыць пра закрыцьцё каналу: журналісты ў свабоднай краіне маюць права і на правакацыю.

**АК; «Газэта Выборча», «Эхо Москвы»**

# Эўрасаюз пазбавіць Беларусь гандлёвых прэфэрэнцыяў

Фармальнае рашэньне ў гэтай справе было прынятае міністрамі краінаў Эўразьвязу 20 сьнежня без аніякай дыскусіі.

Супраць гэтага выказваліся Латвія, Літва і Польшча, заяўляючы, што такі крок ударыць не па прадстаўніках рэжыму, але па звычайных беларусах, аднак супраціву трох краінаў аказалася недастаткова.

Праўда, на справе рашэньне аб пазбаўленьні Беларусі гандлёвых прэфэрэнцыяў мае хутчэй сымбалічны, чым практычны эфэкт. Яно ўвойдзе ў сілу толькі праз 6 месяцаў пасьля фармальнага прыняцьця, а прадстаўнікі беларускага ўраду заўжды могуць зрабіць нейкія фармальныя крокі, каб яшчэ адцягнуць яго прымяненьне.

Пад рэжым гандлёвых прэфэрэнцыяў падпадаў беларускі экспарт на 300—500 млн эўра, аднак страты Беларусі будуць намнога меншыя. Ня ўсе артыкулы экспарту стануць нявыгаднымі для экспарту ў выніку ўвядзеньня дадатковых мытаў.

**МБ; з выкарыстаньнем інфармацыі радыё «Свабода»**

# Канада ўвяла санкцыі супраць Беларусі

Абмежаваньні тычацца экспарту тавараў у Беларусь. Паводле пастановы, любая кампанія, якая пажадае прадаць тавар у Беларусь, павінна зьвярнуцца да ўладаў па экспартную ліцэнзію. Міністар замежных справаў Канады Пітэр Маккей сказаў: «Канада і міжнародная супольнасьць павінны аказваць ціск на Беларусь, каб палепшыць умовы жыцьцё людзей».

Беларусь амаль не імпартуе прадукцыі з Канады, таму санкцыі маюць сымбалічны характар.

**Паводле радыё «Свабода»**

Камэнтар Сяргея Богдана — старонка 8.

# Фатальны шлях санкцый

Канада першай увяла эканамічныя санкцыі супраць Беларусі. Камэнтуе **Сяргей Богдан**.

Гаворачы пра ўплыў эканамічных санкцыяў на палітычныя пераўтварэньні ў краіне, варта памятаць, што яны выклікаюць цэлы шэраг непазьбежных нэгатыўных наступстваў для пацярпелай краіны пры няпэўнасьці дасягненьня канчатковай высакароднай мэты. Магчымыя эканамічныя санкцыі міжнароднай супольнасьці ў дачыненьні да Беларусі нібыта павінны спрыяць дэмакратызацыі краіны.

Абвяшчаючы ў панядзелак аб абмежаваньні экспарту тавараў у нашую краіну, канадзкі ўрад дэкляраваў акурат такую мэту. Эўрасаюз пакуль устрымаўся ад крокаў у гэтым напрамку дзякуючы пазыцыі сумежных зь Беларусяй дзяржаў. Абурацца гэтай эўрапейскай асьцярожнасьцю ня варта — яна мудрэйшая за канадзкую прынцыповасьць. Каб зразумець чаму, зірнем на няпросты балянс вынікаў і выдаткаў рэжыму санкцыяў.

## Санкцыі — гэта фантом

Эканамічныя санкцыі і нават поўная блякада самі па сабе яшчэ ніколі і нідзе не выклікалі палітычных зьмяненьняў. Перамена высьпявала ў выніку ўнутраных працэсаў, ім маглі дапамагчы гэтыя санкцыі, але толькі неапраўдана высокім коштам для разьвіцьця краіны ў далейшым (калі мэта не апраўдвае сродкі). Нагадаем, нават фактычная эканамічная блякада не зваліла рэжымы на Кубе, у Іраку ці Паўночнай Карэі. Санкцыі не наблізілі палітычных пераменаў у Іране, Лібіі ды Бірме. Такім чынам, калі эканамічныя санкцыі мала дзе ў сьвеце прыводзілі да дэмакратызацыі, дык чаму тады сучасная Беларусь будзе выключэньнем з гэтага правіла?

У выпадку наяўнасьці сапраўды жыцьцёва важных для сваіх нацыянальных інтарэсаў праблемаў буйныя краіны (ЗША, Вялікая Брытанія) ня раз зьвярталіся да санкцыяў і блякады апанэнтаў, але *ніколі* не дасягалі жаданага выніку, гублялі ўрэшце цярплівасьць і пераходзілі ў сваёй палітыцы да больш радыкальных і ваяўнічых наступных пунктаў пляну — калі гэта *сапраўды* было ім трэба (як ЗША ў выпадку Нікарагуа ці Іраку). Беларусь з гэтага пункту гледжаньня мае жыцьцёва важнае значэньне для нацыянальных інтарэсаў толькі адной буйной дзяржавы, здатнай на шырокамаштабныя пасьпяховыя дзеяньні ў дачыненьні да менскага рэжыму — Расеі.

Нават Польшча тут мае і яшчэ доўга будзе мець толькі другарадную ролю. Нямецкая ж палітычная эліта аддае перавагу дамоўленасьцям з Масквой, яшчэ баючыся, праўдападобна, «ваймарскай» Расеі, якая, як мяркуюць бэрлінскія стратэгі, калі яе залішне пакрыўдзіць на «нацускраінах», можа фашызавацца падобна Ваймарскай рэспубліцы пачатку 1930-х гадоў.

Можна запярэчыць, што цяпер зьявілася новая сіла — Эўразьвяз. Але гэты актор адрозны па якасьці ад нацыянальных дзяржаваў. Я маю на ўвазе перадусім асаблівасьці структуры ЭЗ, дзе рашэньні прымаюцца зусім ня так зладжана і далёка ня так адназначна, як у звыклых для нас структурах нацыянальных дзяржаваў. Нацыянальная дзяржава — гэта значыць манаполія гвалту пэўнай структуры на пэўнай тэрыторыі (умоўна кажучы, Магілеў ня можа беспакарана не выконваць беларускія законы ці аддзяліцца ад Беларусі), а ЭЗ — добраахвотнае аб'яднаньне, і пра такую манаполію гвалту на ўзроўні Зьвязу казаць не выпадае. Брусэль хутчэй каардынуе, чым наагул нешта вырашае, а фактычна любая складовая частка яго тэрыторыі, ня згодная з Брусэлем, можа выйсьці са Зьвязу (як некалі Грэнляндыя).

Вялікія спадзевы з ЭЗ беларускія дэмакраты пачалі зьвязваць з абмеркаваньнем беларускага пытаньня ў Эўрапарлямэнце. Але перабольшваць значэньне гэтых абмеркаваньняў ня варта, бо рэзалюцыі Эўрапарлямэнту па міжнародных пытаньнях, міжнародных адносінах і візавай палітыцы, вядома, важныя, але палітыкі ЭЗ насамрэч не вызначаюць. Ахвотныя могуць гэта спраўдзіць нават па просьценькай схеме трох апораў супольнай палітыкі ЭЗ.

Вызначаюць жа эўразьвязаўскую замежную палітыку ўрады. Больш за тое, фактычна гэта робяць перш за ўсё ўрады старых сяброў Зьвязу — прытым, нашыя зычлівыя польскія і балтыйскія суседзі ня змогуць ў бліжэйшай пэрспэктыве нешта ў гэтым зьмяніць, ды пераарыентаваць палітыку Зьвязу ў дачыненьні да Ўсходняй Эўропы. Справа ў тым, што нават разам узятыя яны мала што могуць проціпаставіць аўтарытэту ці эканамічнай магутнасьці старых чальцоў Зьвязу. А старыя чальцы Зьвязу заўжды былі куды больш зацікаўленыя ў міжземнаморскім і блізкаўсходнім напрамках замежных зносінаў (з сваіх гістарычна абумоўленых меркаваньняў).

Таму верагодныя санкцыі ў дачыненьні да Беларусі з заходняга боку рызыкуюць застацца толькі прыгожым жэстам ўвагі да прынцыпаў дэмакратыі (што не зьмяншае катастрафічнай іх цаны для самой краіны, бо на краіны ЭЗ прыпадае ўжо каля паловы нашага замежнага гандлю). Большага ўмяшаньня з заходняга боку Лукашэнку баяцца няма чаго, мы настолькі нікому на тым баку не дапякаем, каб ён пачаў якія-кольвечы радыкальныя захады. Баюся, што пакуль толькі Пуцін «думае пра Беларусь».

## Санкцыі як шлях у Трэці сьвет

Шанцы на дэмакратызацыю праз санкцыі — невялікія. А як жа з цаной, якую давядзецца заплаціць

краіне, якая пад іх трапіла? Тое, чым абарочваюцца дэмакратызацыйныя санкцыі, я пастаянна назіраю, прыяжджаючы ў Іран. Гэтая краіна да санкцыяў мела найсучаснейшае абсталяваньне і імкліва мадэрнізоўвалася, імпартуючы зь усяго сьвету нават найдаражэйшыя дасягненьні чалавечага розуму (нафтавых грошай хапала!). Іран вось-вось павінен быў далучыцца да новых індустрыйных краінаў… Сёньня ён адкінуты на дзесяцігодзьдзі назад, бо вымушаны двойчы «вынаходзіць усе ровары», альбо закупляць іх састарэлыя тэхналёгіі ў далёка ня лідэраў тэхналягічнай галіны кшталту Расеі ды Пакістану. Гэта выснажвае інтэлектуальныя рэсурсы, марнуе грошы, стрымлівае развіцьцё, а, урэшце, пакуль ні на цалю не наблізіла дэмакратычныя зрухі. Прытым краіна застаецца ў шэрагах Трэцяга сьвету.

Вядома, Іран — крайні прыклад, але і Беларусь можа апынуцца ў падобнай нязручнай сытуацыі, і нават з Другога сьвету выпасьці ў Трэці, усё праз санкцыі, бо грошай на куплю тэхналёгіяў і тавараў па трайной цане ў нас няма, як няма той самай нафты. Санкцыі гіпатэтычна, згодна з марамі іх прыхільнікаў, набліжаюць дэмакратызацыю ў сьветлай будучыні, але руйнуюць любую краіну ўжо сёньня, замаруджваюць развіцьцё ва ўсіх галінах. Пазаўтра *можа* (!) адбыцца рэвалюцыя, але ўжо сёньня прадпрыемствы трацяць магчымасьці для мадэрнізацыі і выхаду на рынкі. А стабільна замацавацца на рынках вымагае вялікай і працяглай працы. Нават самая лепшая дэмакратычная рэвалюцыя не адновіць вокамгненна парушаныя санкцыямі эканамічныя сувязі, ня выправіць спрычыненыя санкцыямі перакосы.

Вядома, першы вінаваты — той, хто давёў край да санкцыяў, усталяваўшы непрымальны для нас рэжым палітычнага кіраваньня. Але калі мы дбаем пра інтарэсы краіны ў далёкай пэрспэктыве, дык ня можам вітаць санкцыі, якія руйнуюць край у пагоні за зданьню дэмакратызацыі. У зруйнаванай краіне Трэцяга сьвету ня будзе дэмакратыі. Нельга ўсьлед за рэжымам проста грэбаваць пагрозай разбурэньня краіны на шляху да палітычнай перамогі. Гэта будзе антынацыянальная палітыка.

**Працяг са старонкі 3.**

школу.

**Марыман напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 17:03**

Вось менавіта ў Польшчы зь яе радыё «Марыямі» і ідзе ўсё да хрысьціянскага фундамэнталізму!

**С.П. напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 17:16**

Alaksiej, ну а што добрага дае істотная роля рэлігіі ў жыцьці грамадзтва жыхарам, скажам, ЗША ці Польшчы? Што, там лепш вырашаюцца нейкія сацыяльна–эканамічныя праблемы ў параўнаньні з краінамі, дзе рэлігія ня мае такога ўплыву? Ці там, можа, жыхары ў масе сваёй больш маральныя і дабрадзейныя? Параўнальная статыстыка хоць бы аб узроўні злачыннасьці ў розных краінах не дазволіць прыйсьці да такой высновы.

**Марыман напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 18:08**

Духоўнасьць і маральнасьць разьвіваюцца самім чалавекам, а рэлігіі толькі паразытуюць на гэтых пачуцьцях. Усе рэлігійныя аб’яднаньні мусяць быць прыраўнаныя да грамадзкіх арганізацый. Чым Экзархат лепшы за Саюз пісьменьнікаў?

**Славянка напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 18:33**

Аўтар маніць наконт вяртаньня атэізму як дзяржаўнай ідэалёгіі. У артыкуле Рубінава асуджалася залішняя актыўнасьць царквы ў парушэньні Канстытуцыі, яе неапраўданае імкненьне ў школу, і ня толькі ў школу, але і ў армію. Калі нехта не разумее розьніцы паміж сьвецкім і атэістычным, то гэта ягоныя праблемы. Зь якой бы нагоды дзяржава ні імкнулася да сьвецкасьці, я магу толькі вітаць гэта. Чым больш адукаваным і больш вольным у сваім мысьленьні будзе народ, тым менш будзе ў грамадзтве цемрашальства і гвалту. «А хрысьціянства дае надзею ўсім!» — а вось ня трэба гаварыць за ўсіх. Хрысьціянскае цемрашальства нічым ня лепей якога іншага.

**Рэд. Славянцы напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 18:54**

Калі б гэта быў просты аўтар... А тут кіраўнік ідэалягічнага ведамства... Адзін пішам, два наўме, кажа прымаўка. На справе гэты артыкул азначае ўскосны загад ідэалягічнай вэртыкалі і тайнай паліцыі. Дысэртацыі на рэлігійную тэматыку будуць забараняцца. Ксяндзоў і пратэстанцкіх сьвятароў перастануць пускаць у навучальныя ўстановы, як ужо забаранілі пускаць беларускамоўную інтэлігенцыю. Сыстэма робіць яшчэ адзін крок да татальнасьці — цяпер ужо зьбіраецца «вызваляць людзей з–пад уплыву царквы», хоць законы, канстытуцыя і міжнародныя нормы адносяць рэлігію і веру да справаў сумленьня. З чаго гэта дзяржава бярэ на сябе права кагосьці вызваляць з–пад уплыву царквы? Артыкул Рубінава яшчэ раз сьведчыць, што ў так званых ідэалягічных аддзелах (таксама супярэчных канстытуцыі і эўрапейскім нормам) акапаліся інтэлектуальныя сталіністы. Аналізаваць такія артыкулы, лічым, патрэбна. Цікава, што гэты артыкул даслаў да нас аўтар з Докшыцкага раёну. Там, у глыбінцы, людзі тонка адчуваюць, што стаіць за гладкімі словамі ўлады.

**Віктар Місевіч напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 22:24**

Змаганьне з Богам — гэта змаганьне з чалавекам. Савецкі атэізм панішчыў храмы і панішчыў беларусаў. Сёньня маем тое, што маем: паўсюднае п’янства і маральная разбэшчанасьць. Я — каталіцкі сьвятар, і не па газетных артыкулах ведаю жыцьцё простых людзей. Тым, хто за атэізацыю дзяржавы, хачу параіць: прайдзіцеся па калядзе, зайдзіце ў кожны дом на вёсцы, у горадзе і ўбачыце, што мы маем сёньня. Людзі ІСНУЮЦЬ без надзеі, ня маюць сэнсу жыцьця. Асабліва моладзь. Нядаўна ў маёй парафіі павесіўся 18–гадовы юнак. Ён ужо ня першы. Упэўнены, што, каб верыў у Бога, меў кантакт са сьвятаром — не ўчыніў бы гэткага. А ў школу мяне не пускаюць, і не таму, што настаўнікі супраць. Проста спадары ідэолягі палічылі за лепшае насаджваць кругом БРСМ, зь якога ўсе толькі сьмяюцца, чым дазволіць дзецям пазнаёміцца бліжэй з дзесяцьцю прыказаньнямі. Як не прынёс Беларусі карысьці савецкі атэізм, так не прынясе і ўласнабеларускі. Гэта прысуд на самавынішчэньне нацыі.

**Віталь зь Менску напісаў(ла) Сьнежань 14, 2006 у 23:46**

Там, у дзяржаўных вярхах, лічаць, што Лукашэнка — Бог, і ўсё, што не па яго волі — злачынства. Таму й ня дзіўна, што йдзе гаворка пра поўнае падпарадкаваньне ўсяго грамадзтва Богу–Лукашэнку. Царква, па дзяржаўнай ідэалёгіі, павінна мець месца найміта ў дзяржаўных гульнях, а ня быць самастойнай сілай, якая яшчэ й кіруецца воляй Божай, вышэйшай за прэзідэнцкую. Рубінаў кажа пра тое, што нельга пускаць царкву далей тых межаў, якія патрэбны сёньняшняму кіраўніцтву. Нельга нікому сёньня на Беларусі мець сваё Я. Вось так дзяржава знаходзіць сабе ўсё новых і новых ворагаў. Мала ім шчаміць іншадумцаў... Прыйшоў час і за сваіх узяцца. Ну–ну...

# Актуальныя левыя

Саюз беларускіх левых створаны на ўкраінскай зямлі. Калякін: стварэньне Саюзу левых сілаў прадыктаванае момантам. Бухвостаў: непавага да правоў працоўных спарадзіла тры страшныя зьявы — фашызм, нацызм і сталінізм.

У Чарнігаве 17 сьнежня адбылася ўстаноўчая канфэрэнцыя аргкамітэту Саюзу левых партыяў. У працы канфэрэнцыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі ПКБ, БСДП (Грамада) і жаночай партыі «Надзея». Для правядзеньня канфэрэнцыі спрабавалі адшукаць памяшканьне ў Беларусі, але рады не далі, таму сход прайшоў у суседзкім Чарнігаве.

У Чарнігаўскі Палац культуры зьехаліся партыйцы з усіх рэгіёнаў Беларусі. Шмат хто, як магілёўская дэлегацыя партыі «Надзея», сутыкнуліся з праблемамі падчас перасячэньня беларуска-ўкраінскай мяжы. Усяго ў працы канфэрэнцыі ўдзельнічалі 484 чалавекі, звыш ста дэлегатаў з той ці іншай прычыны не змаглі дабрацца да Чарнігава.

Дэлегаты канфэрэнцыі падабраліся надзіва стракатыя. На чыіхсьці пінжаках красаваліся камсамольскія значкі з савецкай сымболікай, на іншых — бел-чырвона-белыя сьцяжкі і значкі «За свабоду». Трэба адзначыць, што ня ўсе партыйцы ўхвалілі ідэю стварэньня Саюзу левых сілаў. З рэзкай крытыкай чарнігаўскай канфэрэнцыі выступіў сацыял-дэмакрат Анатоль Сідарэвіч: ён прынцыповы праціўнік саюзаў з камуністамі.

У асноўным на канфэрэнцыі прысутнічалі людзі старэйшага і сярэдняга пакаленьняў, было зусім мала заўважана моладзі, хаця, паводле сьпісаў удзельнікаў, 111 чалавек былі ва ўзросьце да 30 гадоў. Моладзь асабліва не праяўляла сваёй актыўнасьці. Што праўда, і старэйшыя не былі цалкам абазнаныя ў партыйных рэаліях. Мужчына, што сядзеў за мной, увесь час пытаўся ў свайго калегі, хто сядзіць у прэзыдыюме, а тамака ў асноўным была прадстаўлена вярхоўка партыяў.

Канфэрэнцыю на беларускай мове вёў намесьнік старшыні БСДП (Грамада) Аляксей Кароль. Спачатку былі вырашаныя арганізацыйныя пытаньні, хаця сп.Кароль і адзначыў, што ў іх усё адно ўзьнікнуць праблемы зь Мінʼюстам.

Аляксандар Бухвостаў расказаў, што налета мае быць праведзены ўстаноўчы зьезд Беларускай партыі працоўных, якая паўстане на месцы ліквідаванай партыі працы, а пазьней далучыцца да Саюзу левых партый. Бухвостаў адзначыў, што непавага да правоў працоўных спарадзіла тры страшныя сусьветныя зьявы — фашызм, нацызм і сталінізм.

Старшыня жаночай партыі «Надзея» Алена Яськова не пакінула яснага і адназначнага ўражаньня. Яна ў асноўным гаварыла звыклыя рэчы з багажу апазыцыйнага палітыка пра дэмакратыю, свабоду, канстытуцыю. Назвала Беларусь «запаведнікам хамства» і выказала ўпэўненасьць, што гэты лад хутка зьменіцца.

Сяргей Калякін, у сваю чаргу, адзначыў, што «гэтая канфэрэнцыя ня ёсьць штучнай, а прадыктаваная момантам. Улада манапалізавала левы флянг Беларусі, але задача ўдзельнікаў сёньняшняй канфэрэнцыі зламаць гэтыя стэрэатыпы». Выступ Калякіна быў вельмі энэргічным, ён сем разоў зрываў авацыі залі. Старшыня ПКБ назваў мясцовыя выбары фарсам, а таксама першы ў гэты дзень заклікаў вызваліць палітвязьняў. Калякін таксама, як і Яськова, гаварыў, што беларускім уладам засталося ўжо нядоўга, а асноўнай задачай левых партыяў назваў «разбурэньне сьцяны страху».

Перад выступам старшыні БСДП (Грамада) Анатоля Ляўковіча з залі прыйшла цыдулка з пытаньнем: «Чаму пад канчатковым дакумэнтам канфэрэнцыі стаіць подпіс Ляўковіча, а не Казуліна? Раіса Міхайлоўская, прэс-служба А.Казуліна». Як высьветлілася, Ляўковіч па сёньня афіцыйна зьяўляецца старшынём партыі, а зьезд, дзе быў абраны Казулін, Мінʼюст не прызнаў.

Ляўковіч выступаў імпэтна. Сярод іншага ён адзначыў, што для БСДП (Грамада) адной з асноўных задач «зьяўляецца нацыянальна-культурнае разьвіцьцё». Менавіта Ляўковіч першым на канфэрэнцыі гукнуў у залю «Жыве Беларусь!». Па-беларуску таксама выступаў і адвакат Казуліна Ігар Рынкевіч, які распавёў пра сваю нядаўнюю сустрэчу з Казуліным. Рынкевіч сказаў, што Казулін падтрымаў гэтае абʼяднаньне. «Краіне патрэбныя актуальныя левыя, якія здольныя перамагчы», — гаварыў Рынкевіч.

Канфэрэнцыя аднагалосна вырашыла абраць ганаровым старшынёй Саюзу левых партыяў экс-кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Казуліна.

Яшчэ было шмат выступаў, але не было канкрэтных прапановаў, што рабіць і як перамагаць. Чыталіся ўрыўкі зь вершаў беларускіх савецкіх паэтаў-аўтсайдэраў кшталту Івана Батрака. Праграмная заява была падтрыманая амаль усімі дэлегатамі бяз значных паправак. Цяпер чарга за Мінʼюстам.

Пры вяртаньні ў некаторых удзельнікаў чарнігаўскай канфэрэнцыі ўзьніклі праблемы на перасячэньні мяжы.

**Зьміцер Панкавец,**
**Чарнігаў – Менск**


ЗЬМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

**Аляксандар Бухвостаў (зьлева), Сяргей Калякін і Анатоль Ляўковіч намацваюць новы шлях.**

# Пальцы адной рукі

Аб'яднаньне левых сілаў — гэта прадвесьнік зьяўленьня цывілізаванай палітычнай сыстэмы, у якой для папулістаў ды маргіналаў будзе прадугледжанае месца не ў прэзыдыюме, а на галёрцы. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Адна з самых вялікіх праблемаў апошняга часу — неймаверная блытаніна ў азначэньнях. Яна ніяк не дае нам паразумецца. Адно слова «дэмакратыя» чаго вартае. Для адных гэта — самы справядлівы лад, для іншых — пачвара зь сямю галовамі. Для кагосьці нацыяналісты — гэта фашысты, для іншых — гэта патрыёты. У сваю чаргу, апошнія словам «патрыёты» называюць «лукашыстаў» ды апартуністаў. А калі замежны журналіст прыяжджае да нас, а потым піша ў артыкуле пра «правых» ды «левых», то даўмецца, каго ён мае на ўвазе, найчасьцей проста немагчыма.

Асабліва дасталося дыхту тэрмінам «сацыялісты», «левыя» — надта шмат авантурыстаў ды круцялёў прыцягвае да сябе ідэя сацыяльнай справядлівасьці. Але калі мы разгорнем першы нумар «НН» (1906 году), то ўжо ў рэдакцыйным артыкуле прачытаем, што газэта стваралася для таго, каб патрапіць «і пад стрэху бедной курной хаты мужыка-беларуса». Ці вось сёмы нумар «НН» — вялікае фота дэпутатаў першай Думы Аладзіна, Жылкіна ды Анікіна, якія «наймацней стаялі за народную свабоду і зямлю для працуючых на ёй». Пачытаеш артыкулы, вершы, апавяданьні ды зразумееш: «Наша Ніва» пачатку мінулага стагодзьдзя была газэта спрэс сацыял-дэмакратычная. І гэта натуральна: якія яшчэ погляды маглі быць сапраўды прагрэсіўнымі ва ўмовах расейскага манархічнага рэжыму?

## Сацыялізм зь нечалавечым тварам

Савецкі лад ня толькі вынішчыў выбітных беларускіх сацыял-дэмакратаў фізычна — ён падмяніў само разуменьне ідэі сацыяльнай справядлівасьці. Калі той брутальны строй, які будаваўся ў СССР, называўся сацыялізмам, то камунізм мусіў стацца сапраўдным пеклам. Ня дзіва, што ў многіх людзей, крытычна настроеных да савецкага ладу, выпрацаваўся ўстойлівы ванітны рэфлекс на словы з коранем «сацыял». Іншыя ж, наадварот, намёртва зьвязалі гэты корань з навязанымі стэрэатыпамі ды ўласнымі фантазіямі пра ідэальны савецкі лад. Менавіта на эмоцыях гэтых людзей грае, бы на тых цымбалах, усе 12 год свайго прэзыдэнцтва Аляксандар Лукашэнка. Фактычна, ён скраў у сацыял-дэмакратаў іх базу — сумленьне ды палітычная культура не дазволілі ім паабяцаць народу столькі, колькі яму наабяцаў «адзіны сапраўдны сацыяліст». Вось і выйшла, што найбольш актыўнай засталася менавіта тая частка апазыцыі, якая мае больш ці менш правыя (у рамках заходняй тэрміналёгіі) погляды. Спаборніцтва з Лукашэнкам вялося на ўзроўні ідэалаў (незалежнасьць супраць зьліцьця з Расеяй, нацыянальная культура супраць нэасавецкае і г.д.), аднак пры гэтым прэзыдэнт учэпіста трымаў у руках усе козыры сацыял-дэмакратаў.

Але ці ёсьць Лукашэнка сапраўды сацыялістам? Ці той лад, які ствараецца ў Беларусі, сапраўды бярэ ад сацыялістычнага ідэалу ўсё найлепшае? Лёгка заўважыць: апошнім часам маска сацыяльнай справядлівасьці пачала спаўзаць, агаляючы брутальны капіталізм. Кантрактная сыстэма ператварае людзей ва ўласнасьць карпарацыі-дзяржавы. Пікнуў? Сядзі бяз працы. Краіна, дзе большасьць не зарабляе і трохсот даляраў у месяц, пужае заходнеэўрапейскімі цэнамі ў крамах. Мэдыцына негалосна зрабілася платнай (калі не праз касу, дык праз кішэню) пры фактычна адсутнай сыстэме страхаваньня. Рамонты за бацькоўскі кошт у школах, непамерныя цэньнікі за вучобу ва ўнівэрсытэтах. Улада звыкаецца да шыку. Гарналыжныя курорты ды лядовыя палацы нагадваюць забавы арабскіх шэйхаў — працоўнаму народу ад іх карысьці мала. Дробныя чыноўнічкі паводзяць сябе, нібы паны, буйныя — нібы магнаты. То бок, па-хамску. Прылюдны гандаль «Белтрансгазам» уражвае сваім цынізмам. Трэба мець немалы талент, каб яшчэ доўга падтрымліваць веру беларусаў у сацыяльную справядлівасьць такой сыстэмы.

## Свабода супраць несвабоды

У сталых заходніх дэмакратыях звычай змагаюцца дзьве асноўныя палітычныя сілы. Левыя кажуць: дзяржава павінна дапамагаць чалавеку, а рынак не павінен яму замінаць. Правыя лічаць: дзяржава не павінна замінаць чалавеку, а рынак павінен яму дапамагаць. Фактычна, яны глядзяць у адным накірунку, толькі акцэнты ставяць па-рознаму. У гэтым і ёсьць сакрэт стабільнасьці сьпелых дэмакратыяў. Але што выходзіць у Беларусі? У нас дзяржава ды рынак зьліліся разам, і чалавеку гэтая сумесь не дапамагае, а замінае. Чым далей — тым болей. Тут хаваецца шанец для беларускіх сацыял-дэмакратаў. Рэжым Лукашэнкі яшчэ трымае ў руках тыя козыры, але іх фарбы ўжо пабляклі. Рана ці позна крыўда на такі дзяржаўны лад зробіцца агульным месцам у дыскусіях на кухнях. А хто лепей за сацыял-дэмакратаў умее распавесьці пра сапраўдную справядлівасьць!

Праўда, маем адну праблему. Ёсьць толькі адно словазлучэньне, якое выклікае больш кпінаў за тэрмін «аб'яднаная дэмакратычная апазыцыя» — гэта «аб'яднаныя беларускія сацыял-дэмакраты». Звадкі сярод нашых сацдэмаў абрыдлі ня менш за навіны пра птушыны грып: сэзонная зьява. Таму ёсьць небясьпека, што створаны 17 сьнежня Саюз левых партыяў станецца чарговым недзеяздольным палітычным праектам. Магчымая, аднак, і такая сытуацыя: пагаршэньне эканамічнага стану ў краіне проста прымусіць сацыял-дэмакратаў актывізавацца. Калі сваімі дзеяньнямі яны змогуць узмацніць апазыцыю, пашырыць фронт змаганьня з рэжымам з чыстых ідэалаў на прыземленыя гаспадарскія праблемы, то зьявіцца шанец на зьмены.

У любым выпадку, аб'яднаньне левых сілаў — гэта прадвесьнік таго, што некалі ў Беларусі зьявіцца цывілізаваная палітычная сыстэма «правыя-левыя», у якой для папулістаў ды маргіналаў будзе прадугледжанае месца не ў прэзыдыюме, а на галёрцы. Тым больш, што такая сыстэма дапамагла б пазьбегнуць барацьбы грашовых кланаў па прыкладзе Украіны ці ўсталяваньня ў Беларусі шпегакратыі накшталт той, якая зараз узяла верх у Расеі.

Ці існуе прынцып, які аб'ядноае правае ды левае крылы беларускае апазыцыі тады, калі сацыял-дэмакраты выйдуць зь летаргічнага сну, уваб'юцца ў сілу? Натуральна. Беларусь пакуль не Нямеччына, ня Францыя і нават ня Польшча. Галоўная спрэчка ў нашай краіне вядзецца не пра тое, колькі падаткаў трэба спаганяць. Ідзе барацьба двух прынцыпаў — свабоды і несвабоды. У гэтым сэнсе правыя і левыя — пальцы, якія растуць з адной рукі.

# Цёплая зіма 2006-га

Ці Бог ізноў ашчаджае беларусаў? Піша **Віталь Тарас**.

## Юбілей

«Цяжка ўявіць сабе, што гэты цудоўны пісьменьнік жывы. Цяжка паверыць, што ён ходзіць па вуліцах разам з намі. Здаецца, быццам ён памёр.

Бо ён напісаў столькі кніжак! Кожны чалавек, напісаўшы столькі кніжак, даўно ляжаў бы ў магіле. Але гэта — сапраўдны нечалавек! Ён жыве і ня думае паміраць, на ўсеагульнае зьдзіўленьне. Большасьць лічыць, што ён даўно памёр — настолькі вялікае захапленьне ягоным талентам… І ён сам напэўна ў гэта ня верыць. Алё ён безумоўна памрэ. Яму паставяць агромністы помнік, а ягоным імем назавуць іпадром — бо ён так любіў коней. Магілу ягоную агародзяць мэталічнай рашоткай. Так што ён можа не хваляваецца. Мы ўбачым на ёй ягоны барэльеф.

Заўчора я пачуў, што ён сканаў. Аб гэтым паведаміла мая дачка, якая любіць пажартаваць. Я, праўду кажучы, адчуў радасьць і гонар за нашага сябра-таварыша.

— Нарэшце, — усклікнуў я, — ён зойме месца ў літаратуры!
Радасьць была дачасная. Але я думаю, доўга нам не давядзецца чакаць. Ён нас не расчаруе. Мы ўсе верым у яго. Мы пажадаем яму завершыць працу, якую ён яшчэ ня скончыў, і як мага хутчэй узрадаваць нас».

Гэта фрагмэнт апавяданьня расейскага пісьменьніка-гумарыста Віктара Галяўкіна, апублікаванага ў 12-м нумары паўзабытага цяпер савецкага часопісу «Аврора» за 1981 год. Апавяданьне выклікала нечуваны ўсесаюзны скандал. Магчыма, ніхто не зьвярнуў бы ўвагі на тую гумарэску пад назвай «Юбілейная прамова», калі б рэдакцыя ня ўспомніла ў апошні момант пра сапраўдны юбілей і не надрукавала на адкрыцьці нумару партрэт Леаніда Брэжнева. 19 сьнежня 1981 году яму споўнілася 75 гадоў, і жыць генэральнаму сакратару ЦК КПСС заставалася меней за год.

Той нумар часопісу карыстаўся вялікай папулярнасьцю, апавяданьнем зачытваліся, падзяляючы пачуцьці гумарыста. Цяпер цяжка зразумець, што ў ім знаходзілі такога сьмешнага. Але вось нататка таго часу ў газэце «Правда»: «Ваяры вучэбнага танкавага палка Забайкальскай вайсковай акругі на сходзе асабістага складу прынялі рашэньне прасіць міністра абароны СССР залічыць ганаровым курсантам 1-й танкавай роты гэтага палка Генэральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыню Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР, Старшыню Савету абароны СССР Маршала Савецкага Саюзу Леаніда Ільліча Брэжнева. Ідучы насустрач пажаданьням ваярам гарнізону, дзе Леанід Ільліч Брэжнеў пачаў вайсковую службу, міністар абароны СССР Маршал Савецкага Саюзу Дз.Х.Усьцінаў даў загад аб залічэньні таварыша Л.І.Брэжнева ганаровым курсантам першай роты вучэбнага палка».

Тым, хто забыўся ці ніколі ня ведаў скажу, што пералік усіх вышэйшых тытулаў таварыша Брэжнева быў абавязковым для ўсіх публікацыяў у СМІ, таксама, як і напісаньне гэтых тытулаў зь вялікай літары.

А вось яшчэ нататка ТАСС: «КАТМАНДУ. Тут адчынілася выстава, прысьвечаная 75-годзьдзю Л.І.Брэжнева. На ёй прадстаўленыя кнігі «Малая Зямля», «Адраджэньне», «Цаліна», перакладзеныя на нэпальскую мову, іншыя працы савецкага кіраўніка, а таксама шматлікія фотадакумэнты».

Такія паведамленьні на той час нават усьмешкі ўжо не выклікалі — настолькі звыклай часткай савецкага жыцьця яны зрабіліся.

## Прадчуваньне Трэцяй сусьветнай

У той самы час, за некалькі дзён да юбілею генсэка, ТАСС паведамляла з Варшавы: «Вайсковая рада нацыянальнага ўратаваньня працягвае ажыцьцяўляць неабходныя меры, скіраваныя на пераадоленьне перажыванага краінай найвастрэйшага крызысу. Згодна з распараджэньнем Вайсковай рады, падразьдзяленьні Войска Польскага сумесна зь мясцовымі органамі ўнутраных справаў перашкаджаюць спробам правакатараў арганізаваць страйкі на асобных прадпрыемствах».

Размова, нагадаем, ішла пра ўвядзеньне вайсковага становішча ў Польшчы, калі Вайсковая рада (WRON) на чале з кіраўніком ПАРП генэралам Ярузэльскім інтэрнавала дзясяткі тысяч дзеячоў «Салідарнасьці», увяла татальную цэнзуру, гвалтам здушыла страйкі і ўсе праявы грамадзянскага супраціву. Праўда, як выявілася, ненадоўга.

Многія, у тым ліку і ў Савецкім Саюзе, прадчувалі нешта падобнае. Прадчувалі, што не пацерпіць Масква існаваньня вольнай дэмакратычнай Польшчы на заходняй мяжы СССР. Памятаю, як незадоўга да вайсковага перавароту да нас прыехалі сваякі з Польшчы. Для іх, у адрозьненьне ад грамадзянаў СССР, на той момант не было вялікай праблемы атрымаць дазвол на выезд. Яны вельмі неадназначна ставіліся да таго, што адбываецца ў іх на радзіме — да «Салідарнасьці», да Валэнсы. Але яны вельмі трывожыліся за тое, што будзе зь іх краінай далей. Хоць наўпрост яны гэтага й не выказвалі, але пры разьвітаньні мы ўсе адчувалі вялікі сум і хваляваньне, нам чамусьці здавалася, што мы можам ніколі больш ня ўбачыцца. Таму абдымаліся з сваякамі перад іх дарогай мацней, чым калісьці раней, і нават амаль не хавалі сьлёзаў.

Насамрэч убачыцца мы змаглі праз якіх сем гадоў.

Але на той момант, у сьнежні 1981-га, ніхто ня мог быць упэўненым, што Савецкі Саюз не ўвядзе свае войскі ў Польшчу, як перад тым увёў іх у Аўганістан, і не справакуе Трэцюю сусьветную вайну. Масква не рашылася, чакала, што Ярузэльскі сам навядзе парадак. ЗША таксама не сьпяшаліся з рэзкімі дзеяньнямі, абмежаваўшыся асуджэньнем рэжыму і маральнай падтрымкай унутранага польскага супраціву (як цяпер вядома, ня толькі маральнай).

Між іншым, Ярузэльскага цяпер хочуць пазбавіць усіх званьняў за ягоныя злачынствы. А вось аднагодка й сябра Брэжнева — Эдварда Герка, які кіраваў Польшчай да Ярузэльскага і давёў польскую эканоміку да поўнага краху, дагэтуль бальшыня палякаў успамінае зь цеплынёй. Аб гэтым сьведчаць і леташнія сацыялягічныя апытаньні ў Польшчы.

## Рэальны сацыялізм у спадчыну

Да 100-годзьдзя Брэжнева Расейская Фундацыя грамадзкай думкі (ФГД) правяла сацыялягічнае апытаньне, паводле якога 61% рэспандэнтаў лічаць гады яго праўленьня шчасьлівым часам, і толькі 17% — нешчасьлівым.

Прычым, сярод тых, каму ад 36 да 54 гадоў, пазытыўную ацэнку таму часу даюць 75% рэспандэнтаў, і сярод тых, хто старэйшы — 74%.

Наўрад ці падобнае апытаньне, калі б яно праводзілася ў Беларусі, дало б іншыя вынікі. І пацьверджаньнем гэтаму могуць служыць іншыя лічбы. У адказ на пытаньне, што хацелі б рэспандэнты ўзяць з брэжнеўскае эпохі ў дзень сёньняшні, часьцей за ўсё называлася бясплатная адукацыя (14% ад усіх апытаных), ахова здароўя (12%), поўная занятасьць (11%), нізкія цэны (9%), годныя заробкі і пэнсіі (7%), бясплатнае жыльлё (6%). 13% апытаных згадвалі ў гэтым канктэксьце стабільнасьць, упэўненасьць у заўтрашнім дні. Фактычна, гэта ўсё тое, чым ганарыцца сёньняшняя ўлада Беларусі. За выключэньнем «нізкіх цэнаў» (чамусьці апытаныя забываюць пра неаднаразовыя падвышэньні цэнаў за брэжнеўскім часам на так званыя «прадметы раскошы» — дываны, мэблю, аўтамашыны) і «бясплатнага жыльля» (атрыманьня якога можна было чакаць дзесяцігодзьдзямі) усё ёсьць у цяперашняй Беларусі. Прынамсі, калі верыць афіцыйнай статыстыцы, у Беларусі перамог «рэальны сацыялізм», пра які гаварылі брэжнеўскія ідэолягі.

Дый бяз гэтага відавочна, што ўзровень жыцця ў сучаснай Беларусі ня толькі наблізіўся да сярэднестатыстычнага савецкага ўзроўню дваццаціпяцігадовай даўніны, але і значна пераўзышоў яго. Хто зь беларусаў тады, на пачатку 1980-х, мог марыць, скажым пра ўласны «Фольксваген»? Ня кажучы ўжо аб уласным катэджы?

У той самы час, паводле сацыялягічнага апытаньня, праведзенага на замову расейскае дзяржаўнае сацыялягічнае службы ВЦІОМ, аб распадзе СССР шкадуюць 68% апытаных расейцаў і толькі 52% грамадзянаў Беларусі. Аб’яднаньня ж у новы Саюз хацелі б крыху больш паловы расейцаў і толькі 36% беларусаў.

## Упэўненасць у заўтрашнім дні

І гэта натуральна. Навошта імкнуцца да нейкага новага мітычнага саюзу, калі Савецкі Саюз захаваўся ў амаль некранутым выглядзе ў самой Рэспубліцы Беларусь? Дзе захаваліся КГБ, дзяржкантроль, савецкая сыстэма сацыяльнага забеспячэньня і адукацыі, славутыя «стабільнасьць» і «ўпэўненасьць у заўтрашнім дні». Гэта тая самая ўпэўненасьць, якая прымушала дваццаць пяць гадоў таму і прымушае дагэтуль маладых альбо сталых людзей у Беларусі зьяжджаць на Захад. Тая «стабільнасьць і згода», якія пануюць звычайна на могілках і якія прымушалі людзей, не пазбаўленых інтэлекту і гонару, літаральна скавытаць ад тугі. Многія адукаваныя сьпіваліся альбо сыходзілі ва «ўнутранае падполье» за брэжнеўскім часам — ішлі ў качагары, вартаўнікі, падмятальшчыкі.

Здаецца, «мода» на гэтыя прафэсіі сярод творчай інтэлігэнцыі хутка вернецца.

Зразумела, нармальны чалавек ня можа жыць толькі палітыкай і развагамі на палітычныя тэмы. І за брэжнеўскім часам, як і ва ўсе часы, людзі кахаліся, сябравалі, пісалі кнігі, чыталі, хадзілі ў кіно і тэатры, адпачывалі на моры, зьбіралі грыбы й ягады. Адным словам, жылі. Жывуць і зараз.

Сёлетні год запомніцца ня толькі палітычнымі падзеямі — прэзыдэнцкімі выбарамі і Плошчай, галадоўкамі Казуліна і пратэстантаў, сахараўскай прэміяй Мілінкевіча, судамі над маладафронтаўцамі й флэш-мобамі, пікіроўкамі Лукашэнкі й Пуціна. Гэты год, па-мойму, увойдзе ў гісторыю таксама фэнамэнальным ураджаем яблыкаў. Большая частка якога гніе проста ў садах на зямлі ці на сьметніках. І яшчэ год запомніцца фэнамэнальна цёплым пачаткам зімы.

Ці Бог чарговым разам літасьціва ставіцца да беларусаў, даючы ім магчымасць лягчэй перажыць яшчэ адну зіму трывогі нашай, ці рыхтуе нас да сапраўдных выпрабаваньняў?

Мне чамусьці ўспамінаецца анэкдот брэжнеўскага часу. Што напішуць у будучых энцыклапэдыях пра Брэжнева і Андропава? «Дробныя палітычныя дзеячы эпохі Сахарава і Салжаніцына…»

Я ня ведаю, ці назавуць калі-небудзь беларусы сучасную эпоху, скажам, эпохай Васіля Быкава. Але гэтая эпоха ўжо належыць ім — толькі яны гэтага яшчэ не ўсьвядомілі, увесь час азіраючыся на Брэжнева, Сталіна ды іншыя здані мінулага…




BORODULIN'S COLLECTION

# БелТА: У Маскве былі дасягнутыя дамоўленасьці




Вельмі мала інфармацыі надышло з Масквы, дзе ў мінулую пятніцу адбылася сустрэча А.Лукашэнкі і У.Пуціна. Расейскія крыніцы пішуць: перамовы скончыліся зь невакрэсьленым вынікам, і зьвяртаюць увагу на рэмарку Лукашэнкі, што ўдалося дамовіцца пра адзіную канстытуцыю і адзіную валюту.

Беларускае дзяржаўнае агенцтва БелТА дае інфармацыю настолькі агульную, што нават між радкоў цяжка нешта вычытаць: «Прэзідэнты Беларусі і Расіі па выніках двухбаковых перагавораў у Маскве даручылі ўрадам прапрацаваць шэраг дасягнутых на вышэйшым узроўні дамоўленасцей. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы. Як чакаецца, механізмы рэалізацыі дамоўленасцей могуць быць вызначаны ў бліжэйшы час».

Дакладна вядома толькі, што А.Лукашэнка адмяніў плянаваны ўдзел у хакейным матчы з камандай «Газпромэкспарту» і заўчасна вярнуўся ў Беларусь.

**МБ**

# Расейская прэса: Лукашэнку ў Маскве пакінулі без абеду

Крыху сьвятла на перамовы пралілі суботнія нумары расейскай прэсы. У тым ліку спартовай.

Так, «Спорт-Экспресс» у артыкуле «Быков показал, как забивать на Ходынке» аналізуе пятнічны хакейны матч паміж камандамі «Зоркі хакею Расеі» і «Газпромэкспарт». У матчы — паводле дзяржаўных і недзяржаўных беларускіх СМІ — меўся браць удзел кіраўнік Беларусі. Прычым згуляць супраць каманды «Газпромэкспарту», што сымбалічна. Аднак у артыкуле прозьвішча Лукашэнкі нават няма ў пераліку гульцоў.

Пра тое, што прэзыдэнт Беларусі ня толькі не паехаў на хакей, а наагул адразу пасьля перамоваў з Пуціным вярнуўся ў Менск, піша карэспандэнт газэты «Коммерсантъ» Андрэй Калесьнікаў у артыкуле «Лукашэнка быў пакінуты без абеду»:

«Трохгадзінныя перамовы скончыліся, як звычайна, нічым. Прэзыдэнту Беларусі не ўдалося ні на адзін цэнт зьнізіць новую цану расейскага газу для Беларусі. Яна складае 200 даляраў за кубамэтар. Больш за тое, ён атрымаў адмову і па ўсіх астатніх перамоўных пазыцыях. Так, экспартныя пошліны на расейскую нафту для Беларусі ня будуць ні адменены, ні нават зьніжаны. На тое, каб Аляксандар Лукашэнка паверыў у гэта, пайшло амаль дзьве гадзіны з гэтых трох. (...)

Каб ён не рабіў выгляду, што перамовы ўдаліся, то ніхто б, можа, і не зьдзівіўся, калі стала вядома, што адмяняецца супольны абед Аляксандра Лукашэнкі і Ўладзімера Пуціна, а таксама заплянаваная (...) іхная паездка ў новы Лядовы палац на Хадынскім полі (...). Учора ўвечары спадар Лукашэнка зьбіраўся нават выйсьці на лёд і пагуляць за каманду вэтэранаў расейскага хакею».

**АГ**

# «Советская Белоруссия»: «Урад пачне пошукі новых крыніцаў бюджэту»

Орган Адміністрацыі прэзыдэнта даў вельмі абмежаваную інфармацыю пра нафтавае рашэньне Масквы.

У органе Адміністрацыі прэзыдэнта — газэце «Советская Белоруссия» зьявіўся камэнтар на тэму ўвядзеньня Расеяй экспартнага мыта на пастаўкі нафты ў Беларусі. Артыкул Уладзімера Самахвалава мае загаловак «Нафта пахне грашыма».

Аўтар пачынае з апэляцыі да падпісанай у 1999 г. дамовы аб саюзнай дзяржаве і аб супольнай мытнай прасторы. Падпісаны Міхаілам Фрадковым дакумэнт наконт мытаў «СБ» называе «парушэньнем прынцыпаў узаемнага гандлю».

«СБ» прагназуе налета павышэньне коштаў на бэнзін, а таксама карэкціроўку ў сувязі з гэтымі абставінамі бюджэту-2007. Аднак камэнтатар супакойвае: «На ўзровень жыцьця ў Беларусі гэта асабліва не паўплывае». Чалавеку, які не чытаў незалежных СМІ, з артыкулу ў «СБ» немагчыма зразумець, якое канкрэтна рашэньне прыняла Расея, якія прычыны ёю рухалі і якія канкрэтна сумы страціць бюджэт. (Як вядома, «Коммерсантъ» ацэньвае будучыя страты беларускага бюджэту на 1,7—2 млрд даляраў, а эканамісты прагназуюць дэвальвацыю беларускага рубля ў выніку гэтага).

З артыкулу вынікае, што беларускі бок яшчэ разглядае варыянт, што Расея адклікае сваё рашэньне. Бо зараз акурат вядуцца перамовы, каб «дасягнуць кампраміснага рашэньня».

Магчыма, мы станем сьведкамі новых актаў капітуляцыі і здачы Расеі новых элемэнтаў нацыянальнага сувэрэнітэту Беларусі, напрыклад, стварэньня саюзнага парлямэнту ці перадачы 50% «Белтрансгазу».

Калі ж мыты ня будуць зьнятыя, беларусы пагражаюць крокамі ў адказ. Захады Расеі, як кажа ў «СБ» парлямэнтар Анатоль Паўловіч, «могуць значна ўскладніць будаўніцтва саюзнай дзяржавы». Таксама Паўловіч гаворыць, што ў выпадку падаражаньня расейскіх энерганосьбітаў «урад пачне пошукі новых крыніцаў папаўненьня бюджэту».

Цікава, што складаныя «пошукі новых крыніцаў» ускладаюцца на ўрад, не на прэзыдэнта — верная прыкмета таго, што посьпех не гарантаваны.

У апошніх сказах аўтар ганіць пазыцыю ЗША, якая засьцерагла Расею ад выкарыстаньня энерганосьбітаў у якасьці спосабу ціску («хочуць палавіць рыбку ў мутнай вадзе»). Тым самым ускосна завярае Расею: ніякай нармалізацыі адносінаў з Захадам не плянуецца.

**Зьміцер Панкавец**

# Зьняты рэдактар «Роднага слова»

Міхась Шавыркін, які кіраваў унікальным выданьнем ад часу яго заснаваньня, тлумачыць гэта ўмяшаньнем кіраўніцтва праўладнага Саюзу пісьменьнікаў: «Відаць, гэтым спадарам вельмі хацелася друкавацца ў часопісе».


«СБ»

Пра тое, што галоўны рэдактар часопісу «Роднае слова» Міхась Шавыркін **(на фота)** быў зьняты з пасады, калектыву часопісу 15 сьнежня ўранку паведаміў дарадца міністра адукацыі па сувязях з СМІ Віктар Іўчанкаў. Афіцыйная фармулёўка гучала як «звальненьне па згодзе бакоў». Сам сп. Міхась тлумачыць гэта ўмяшаньнем кіраўніцтва праўладнага Саюзу пісьменьнікаў: «Відаць, гэтым спадарам вельмі хацелася друкавацца ў часопісе. Але «Роднае слова» друкуе толькі пісьменьнікаў, чые творы ёсьць у школьнай праграме».

Сёлета ў часопісе зьяўляліся творы Генадзя Бураўкіна, Уладзімера Някляева, Сяргея Законьнікава і іншых вядомых сваёй незалежнасьцю творцаў.

Міхась Шавыркін быў галоўным рэдактарам часопісу 19 гадоў, ад самага моманту яго заснаваньня. Ён застанецца супрацоўнікам рэдакцыі. Выканаўцам абавязкаў галоўнага рэдактара прызначаная Ларыса Сагановіч.

**ЯК**

# Мірон павесіў бел-чырвона-белы сьцяг каля будынку КДБ

Сьцяг зьявіўся позна ўвечары 18 сьнежня на даху жылога дому па вуліцы Савецкай, што стаіць насупраць Віцебскай абласной управы КДБ. У якіх 20-ці мэтрах ад гэтага месца знаходзіцца і райаддзел міліцыі Кастрычніцкага раёну. Тым ня менш, супрацоўнікі абедзьвюх установаў заўважылі сьцяг далёка не адразу: каля гадзіны ён лунаў на вачох у мінакоў.

Віцебскі дысыдэнт Барыс Хамайда мяркуе, што Мірон зьдзейсьніў сваю акцыю адмыслова напярэдадні 20 сьнежня: у гэты дзень у 1917-м была створана ЧК на чале з Фэліксам Дзяржынскім. У Віцебску мясцовае аддзяленьне ЧК мясьцілася ў тым самым будынку, дзе сёньня знаходзіцца ўправа КДБ.

За два дні да таго бел-чырвона-белы сьцяг ненадоўга быў зьявіўся ў самым цэнтры гораду, недалёка ад тэатру «Лялька». Спадар Хамайда сьцьвярджае, што з крыніцы, вартай даверу, яму вядомы зьмест цыдулкі, прымацаванай да гэтага сьцягу: «Ня трэба нікога і нічога баяцца! Усё адно пераможа Беларусь! Віцебскі тэатар «Лялька» застанецца беларускім, а месца РНЕ — на сьметніку гісторыі». Такім чынам, на думку апазыцыянэра, Мірон вырашыў падтрымаць загадчыцу літаратурнага аддзелу тэатру Вікторыю Дашкевіч, якая ня так даўно атрымала ліст ад імя «Русского Национального Единства» з патрабаваньнем перакласьці усе лялечныя спэктаклі на расейскую мову.

**Радыё «Свабода»**

# Салігорскія шахцёры падарылі «Нашай Ніве» талерку

У рэдакцыю «Нашай Нівы» завітаў госьць з Салігорску. Кіраўнік прэс-службы Незалежнага прафсаюзу гарнякоў Дзяніс Таўпека прыехаў у сталіцу, каб падарыць найстарэйшай беларускай газэце да стагадовага юбілею сувэнірную талерку з выявай прафсаюзнай сымболікі. Супрацоўнікам газэты было радасна, што яна, нягледзячы на забарону распаўсюду праз «Белсаюздрук», даходзіць нават у шахты.

У Незалежнага прафсаюзу гарнякоў сёлета свой юбілей — 15-годзьдзе.

З нагоды сьвята ў Салігорскім палацы культуры адбылася канфэрэнцыя. Павіншаваць гарнякоў прыехалі калегі па прафсаюзным руху, кіраўнікі незалежных дэмакратычных прафсаюзаў — Аляксандар Ярашук, Сяргей Антусевіч, Генадзь Быкаў, Юры Швец, а таксама заснавальнікі і першыя актывісты НПГ. Удзельнікаў канфэрэнцыі віталі былы генэральны дырэктар «Беларуськалію» Пятро Калугін і намесьнік па ідэалягічнай працы і кадрах Анатоль Махлай.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Да юбілею актывісты-гарнякі надрукавалі адмысловыя каляндарыкі па-беларуску з актуальным лёзунгам «Толькі разам мы мацнейшыя».

Беларускі незалежны прафсаюз гарнякоў — найбуйнейшая па колькасьці першасная арганізацыя Беларускага незалежнага прафсаюзу. Быў заснаваны 27 сьнежня 1991 г. На сёньня ў склад НПГ уваходзяць больш за 20 арганізацыяў, што аб'ядноўваюць працаўнікоў падразьдзяленьняў, цэхаў і аддзелаў РУП «ВА «Беларуськалій». Агульная колькасьць чальцоў арганізацыі ў 2006 г. перавысіла 4200 чалавек. Старшыня арганізацыі — Мікалай Новік.

**Сямён Печанко**



# Мы ўсё ж прачнемся ў іншай краіне

У Беларусі пачынаюцца ці вось-вось пачнуцца тэктанічныя зрухі. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Наіўна думаць, што зь дня на дзень мы прачнемся ў іншай краіне.

Увогуле і незалежнасьць, і дэмакратыя ня ёсьць панацэяй. Яны ёсьць толькі перадумовай.

Зь іншага боку, ня варта кпіць: глядзеце, маўляў, каб не прачнуцца ў імпэрыі!

Улада, хай сабе і такая-гэткая, відавочна не сьпяшаецца ў расчыненую пастку Крамля. У яе свае засьцярогі.

Пасьля сустрэчы Лукашэнкі з Пуціным у Маскве 15 сьнежня афіцыйнай інфармацыі зноў калiва. Але паводле ўскосных сьведчаньняў можна сабе ўявіць, які армрэстлінг разгортваецца цяпер у двухбаковых адносінах.

Фактычна, Масква перайшла да поўнамаштабных эканамічных санкцыяў.

Днямі давялося пачуць ад дэпутата Касьцяна: маўляў, зараз расейская ўлада, беручы Беларусь за гарляк, фактычна выконвае заакіянскую волю.

Во як! Імпэрыялісты ўсіх краінаў, яднайцеся!

У Масквы і Захаду, натуральна, зусім розныя мэты.

Палітоляг Караганаў, хоць і стаіць на чале двухбаковай праваабарончай камісіі, закідае беларускаму рэжыму найперш ня ўціск тых правоў, але ж антырасейскасьць.

Іншая рэч, што гэта небясьпечны маркер. Лічы, паставілі на адну роўніцу з Саакашвілі, які ніколі ня кляўся класьціся пад натаўскія танкі.

Зь іншага боку, Брусэль ставарае нарэшце нейкае падабенства палітыкі «пугі і перніка». Бонусы за дэмакратызацыю, выкіндэс з прэфэрэнцыяў за ўціск незалежных прафсаюзаў.

Ну і Штаты гнуць сваё. Падоўжылі дзеяньне «Акту аб дэмакратыі». Нават паспрабавалі ўпліпчыць беларускае пытаньне ў фармат Рады бясьпекі ААН.

Факт тое, што зараз пад ціскам з розных бакоў рэжым пачынае нагадваць параход «Чалюскін» у Ледавітым акіяне.

Куды дрэйфаваць? Пасьпешліва сканструяваная ў мазгох тутэйшых стратэгаў «вялікая дуга замежнай палітыкі» насамрэч ёсьць прапагандысцкім міражом.

Дык што, насуперак клятвам давядзецца саступаць трубу?

У незалежныя мэдыі пратачылася вэрсія, што варыянт продажу «Белтрансгазу» бакамі фактычна ўзгоднены.

Магчыма, на экспэртным узроўні [...] паперы насамрэч падрыхтаваныя. [...] галоўнае — палітычнае рашэньне.

І вось тут — глыбокая паўза.

Рэч ня столькі ў самой трубе. Экан[...] Заіка днямі пераконваў мяне, што [...] вага гэтага жалезьзя разьдзьмутая[...]

Аднак жа мы ведаем, як развальва[...] карткавы дамок. Дастаткова высма[...] карту.

Мы ведаем, што такое эфэкт дамін[...] адчуваньне, што ўлада надта баіц[...] эфэкту.

Нарэшце, мы ведаем, як, падточан[...]



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Нацыянальныя прэміі за асабістую мужнасьць

У Менску адбылося ўручэньне Нацыянальных прэмій «Хартыі-97» «За асабістую мужнасьць пры абароне правоў чалавека». Сёлета ляўрэатамі сталі экс-кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Казулін, абаронцы намётавага мястэчка на Кастрычніцкай плошчы, палітвязень Зьміцер Дашкевіч, прафсаюзная актывістка з Бабруйску Алена Захожая і вернікі пратэстанцкай царквы «Новае жыцьцё».

Аляксандар Казулін і Зьміцер Дашкевіч знаходзяцца ў зьняволеньні. Таму Ірына Ка[...] за сына. [...] «Ня веда[...] Пастар «[...] толькі м[...]

Намін[...] сілаў Ал[...] маральн[...]



азуліна атрымала прэмію за мужа, Вячаслаў і Вольга Дашкевічы —
За абаронцаў намётавага гарадка прэмію атрымала Дар’я Зялінская.
аю, якім чынам буду дзяліць яе з усімі абаронцамі», — сказала яна.
«Новага жыцьця» Вячаслаў Ганчарэнка сказаў: «Гэта прэмія ня
не, але і ўсім вернікам Беларусі, а таксама яна належыць Богу».
антаў прыехаў павіншаваць лідэр Аб’яднаных дэмакратычных
ляксандар Мілінкевіч. «Усе сёньняшнія ляўрэаты моцныя сваёй
ю і мужнасьцю, яны надаюць нам надзею і веру», — сказаў ён.

ЗП

нейкія
Але ж

аміст Леанід
стратэгічная
.

ецца
аргнуць адну

о. І ёсьць
да гэтага

ы менавіта

эканамічнымі чыньнікамі, умомант абрынуўся Савецкі Саюз. Хаця маё пакаленьне «зробленых у СССР» было ўпэўнена, што пражыць жыцьцё давядзецца менавіта ў той краіне (гэта потым стала высьвятляцца, што ці ня ўсе былі замаскаванымі дысыдэнтамі).

Беларуская анамалія зацягнулася. Але хіба што пад уплывам хвіліннай слабасьці можа мільгаць роспачная думка, што гэтая анамалія здольная доўжыцца цэлую вечнасьць.

Тэктанічныя зрухі, хай сабе вымераныя пакуль што мілімэтрамі, магчыма, ужо ідуць.

Мы абавязкова прачнемся некалі ў іншай краіне.

# Ніколі не кажы «Белтрансгаз»



Не дае спакою інфа пра хакейны матч супраць зборнай «Газпрому», які прайшоў безь Яго ўдзелу. А што калі гэта прошукі варожай выведкі? Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

— Што вы ведаеце пра Л., Бонд?

Пытаньне трохі зьбянтэжыла агента 007:

— Ну, гэта дыктатар. У яго хранічныя праблемы з прынцыпам аднаго акна. А яшчэ з расейцамі. Апошнія жадаюць прыбраць да рук ягоны «Газтранс» у абмен на пастаўкі газу.

Шэф выведкі Яе Вялікасьці прамовіста паглядзеў на Бонда:

— Акурат таму Л. можа наважыцца на апошні крок. Прапанаваць Маскве згуляць у хакей. Стаўка: яго «Газтранс» супраць яе «Прамгазу». Хто каго перамагае, той таго і акцыянуе. «Прамгаз» ня зможа адмовіцца: хакей, як і гарэлка, для расейцаў — рэлігія.

— Гэта катастрофа! Уся энэргетыка Эўропы ў руках з клюшкай!

— Так, таму вы зараз жа ляціце ў Маскву.

У Шарамецьева Бонда чакаў маскоўскі рэзыдэнт Мі6... Дакладней, чакала. Прыгожая дзяўчына Брыджыт.

Зранку яны адправіліся ў спартовы палац.

— У мяне квіткі на гэтыя месцы на ўсю зіму. Бонд працягнуў доўгі сьпіс месцаў.

— Нашто так многа, — запытала агент, — і чаму ў розных шэрагах?

— Такім чынам пустыя крэслы складуць на сэктары тэкст прамовы Мілінкевіча падчас уручэньня яму Сахараўскай прэміі.

— Аднак пры такіх умовах ён ніколі ня выйдзе на лёд.

— Што нам і трэба.

Самалёт з Л., які так і не згуляў у хакей, узьняўся ў паветра. Раптам Бонд адчуў пад лапаткамі шклянку гарбаты з духмяным палоніем 110. Яго трымала брытанскі рэзыдэнт.

— Што?! Вы разам з гэтым рэжымам? Вы — брытанская арыстакратка?!

— Так, — драпежна ўсьміхнулася Брыджыт. — Я ёй была, аднак кнігі Чаргінца мяне капітальна перакавалі. Праўда, пра гэта ніхто не дазнаецца... Пі, гад!

Шклянка з радыяактыўнай гарбатай наблізілася да роту Бонда.

— Пачакайце, якая ж вы патрыётка, калі карыстаецеся радыяцыйнай зброяй без акцызнай маркі?

— А што, хіба ўведзены акцыз на радыяцыйную зброю?

— Натуральна, а таксама на лінзы для вачэй. Калі ўжо патрыётка, дык няхай усё будзе паводле вашых правілаў. Вось вам, дарэчы, марка.

І Бонд прыляпіў да шклянкі міні-бомбу ў выглядзе акцызнай маркі Рэспублікі Беларусі.

Як перадалі зранку навіны, у маскоўскім раёне Чаромушкі знойдзены труп. Міліцыя лічыць, што ён належаў скінхэду. Прапрацоўваецца вэрсія, што малады экстрэміст падарваўся на бомбе, якую рыхтаваў супраць каўкаскіх гандляроў абрыкосамі.

Бонд слухаў навіны ўжо ў самалёце.

Раптам запілікала мабілка. Гэта быў М.

— Што вы ведаеце пра Касьцяна, Бонд?



**Павал Севярынец** — у 1998 —2004 г. лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Дом ля пагосту

Маласіценскі сельскі савет стаіць на ўскрайку могілак. З вокнаў відаць хіба што зарослыя стогадовымі хвоямі ўзгор'і, дзе ляглі ў зямлю пакаленьні вяскоўцаў. Насупраць уваходу — стандартны савецкі абэліск над брацкім пахаваньнем часоў Другое сусьветнае вайны. Раней там стаяла царква, разабраная на бліндажы ў 1943-м. Цяпер жа вакол галоўнага на бліжэйшыя тысячу квадратных кілямэтраў дому — магільная ціша. Цагляныя сьцены з арнамэнтам па пэрымэтры, музэйнага выгляду чырвоныя шыльды, а наверсе, як, памятаю, жартаваў у пачатку 1980-х бацька, самотна матляецца загадка: «Зімой і летам адным цьветам (гэта сьцяг над сельсаветам)».

Адчуваньне закінутасьці ўзмацняе і тое, што ў вокнах амаль ніколі няма сьвятла. Нехта зь сельскага выканкаму забяжыць удзень, старшыня пасядзіць гадзінку-другую... Наведнікі заходзяць вельмі рэдка — няма сэнсу. Паказальны фурор, які зрабіла нядаўняя поўная, ва ўсе восем вокнаў, вечаровая ілюмінацыя сельсавету. Рэакцыя сіценцаў была такой, быццам у цэнтры вёскі раптам адкрыўся «Дыснэйлэнд». «Што за сьвята?!» — «Ды выбары ж хутка, сядзяць, нешта хімічаць», — «А-а-а... Выбары...»

У гэтым месцы гутарка звычайна абрываецца, і вяскоўцы губляюць усякую ахвоту яе працягваць. А ці можа быць інакш, калі кандыдатаў у той сельсавет тут ніколі не вылучалі, альтэрнатыўнага галасаваньня ніколі не было. А на апошніх «выбарах» дзясяткі сіценцаў, што пазначылі ў бюлетэнях Мілінкевіча, хадзілі й перапытвалі: а дзе нашыя галасы? Калі ад любое патрэбы вяскоўцаў сельсавет адхрышчваецца — «няма грошай»? Калі першым і адзіным абаронцам сельсавету ў вёсцы аказалася старшыня гэтага самага сельсавету?..

«Ага, купілі ў савет машыну. Дык толькі старшыня на ёй па сваіх справах езьдзіць». «А колькі ў іх, сельсавецкага начальства, дома кампутараў ды бытавой тэхнікі, бачыў?!» «Максімкі» або брагі — на кожным рагу, сьпіваецца вёска!» «Ліхтароў па вёсцы няма, памыйкі паўсюль, ніхто не штрафуе!» «Агульныя студні нячышчаныя стаяць, а грошы на гэта зьбіралі!»

Вяскоўцы ня ведаюць, што, паводле Закону аб мясцовым самакіраваньні, сельсавет:

— распараджаецца землямі, нетрамі, водамі, лясамі, паляўнічымі й рыбалоўнымі ўгодзьдзямі, а таксама камунальнай уласнасьцю адпаведнай адміністрацыйнай адзінкі;

— атрымлівае ўвесь падаходны падатак, які сплочваюць на ягонай тэрыторыі фізычныя асобы;

— уводзіць мясцовыя падаткі, зборы й мыты, зьбірае штрафы;

— стварае пазабюджэтныя, рэзэрвовыя й валютныя фонды;

— разьмяркоўвае, паводле ўласнага разуменьня, рэшту, якая застаецца пасьля выкананьня бюджэту...

Вядома, у большасьці выпадкаў на

## ХРОНІКА

### 13 сьнежня

#### Гарадзенскі журналіст арыштаваны на 7 дзён

**Супрацоўнік журналу «Magazyn Polski» Аляксей Салей** быў асуджаны судом Ленінскага раёну Горадні на 7 дзён арышту. Яго затрымалі ўвечары 12 сьнежня і зьвінавацілі ў парушэньні арт.156 (дробнае хуліганства) і 166 (непадпарадкаваньне патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі) КаАП. У судзе супрацоўнікі міліцыі сьведчылі, што журналіст нібыта «нецэнзурна выказваўся». Сьведкаў з боку падсуднага, якія прысутнічалі падчас затрыманьня журналіста, у залю суду не пусьцілі.

#### Кіраўнік віцебскай арганізацыі БНФ не прайшоў рэгістрацыі

**Кіраўніка віцебскай гарадзкой арганізацыі БНФ Уладзіслава Токарава** не зарэгістравалі ў якасьці кандыдата ў дэпутаты ў сувязі зь нібыта вялікай колькасьцю несапраўдных подпісаў на ягоную карысьць. Паводле старшыні камісіі, людзі, якія падтрымалі Уладзіслава Токарава, адмовіліся ад подпісаў. На патрабаваньне спадара Токарава паказаць яму акты адмовы ад подпісаў яму адказалі, што не абавязаныя такія дакумэнты паказваць.

#### Скасавалі прысуд былому судзьдзі

Калегія ў крымінальных справах Гомельскага абласнога суду скасавала прысуд Светлагорскага раённага суду аб пакараньні **былога судзьдзі Сяргея Ярашэвіча** за абразу судзьдзяў з Рагачова. 4 лістапада судзьдзя Сьветлагорскага раённага суду Натальля Белайчук асудзіла С.Ярашэвіча на два гады папраўчых працаў з утрыманьнем на карысьць дзяржавы 20% заробку паводле прысуду.

Падставай для крымінальнага перасьледу Ярашэвіча стаў ягоны запіс у кнізе заўваг і прапановаў Рагачоўскага суду. Ён параўнаў тамтэйшых **судзьдзяў У.Саламейчука** і **М.Рубісава** з судзьдзямі 1937 г.

Крымінальную справу супраць С.Ярашэвіча аб абразе рагачоўскіх судзьдзяў, распачатую абласной пракуратурай, будзе ізноў разглядаць суд Савецкага раёну Гомелю.

### 14 сьнежня

#### У актывіста Саюзу палякаў апісалі маёмасьць

Супрацоўнікі КДБ апісалі маёмасьць гарадзенскага актывіста Саюзу палякаў у Беларусі **Анджэя Лісоўскага**. Цяпер лёс маёмасьці вырашыць суд. Варта нагадаць, што Лісоўскага абвінавачваюць у перавозцы наркотыкаў. Забароненыя рэчывы нібыта знайшлі ў ягонай машыне прыканцы кастрычніка, калі ён зь непрызнанай старшынёй СПБ **Анжалікай Борыс** вяртаўся зь Вільні ў Беларусь.

#### Дранчука могуць вызваліць датэрмінова

Назіральная камісія пры Фрунзэнскім райвыканкаме Менску прыняла рашэньне аб умоўна-датэрміновым вызваленьні актывіста кампаніі па назіраньні за выбарамі «Партнэрства» **Цімоха Дранчука**. Дата выхаду на волю Дранчука вызначыцца 22 сьнежня, калі справу аб умоўна-датэрміновым вызваленьні грамадзкага актывіста раз-

ажыцьцяўленьне ўсіх гэтых паўнамоцтваў сельсавет мусіць атрымаць «дабро» з раёну. Але нават і пры гэтай вэртыкальна-каманднай сыстэме здольны гаспадар, як павялося з савецкіх часоў, «выбівае» з райвыканкаму ўсё, што трэба.

Аднаго падаходнага падатку з рабочых леспрамгасу штомесяц атрымліваецца 2—2,5 тысячы даляраў! А яшчэ ж на тэрыторыі сельсавету некалькі лясьніцтваў. Чыгунка. Крамы. Пошта...

І дзе грошы, як той казаў?!

Сярод двух дзясяткаў вяскоўцаў, апытаных перад кампаніяй «мясцовых выбараў», жаданьне адкрыта выступіць супраць «максімкі», разьбітых дарогаў, паўсюдных сьметнікаў і гідры карупцыі выказалі сямёра.

Загадчыца гаспадаркі вясковага дзіцячага садка адмовілася пасьля гутаркі са сваячкай, у якой у 30-х гадох XX ст. рэпрэсавалі бацьку. Фэрмэр з бліжэйшага хутару думаў тры тыдні, урэшце спаслаўся на ўзрост і сказаў «пас». Былы «аўганец», калі дайшло да афармленьня дакумэнтаў, ня змог знайсьці ўласнага пашпарту.

Але тыя, хто дайшоў да рэгістрацыі, паводзінамі сельсавету былі шакаваныя. Кандыдатаў ад народу ў выбарчай камісіі сустрэлі... ухвальнымі вітаньнямі й гарачай гарбатай. «Вось-вось, менавіта *вас* мы й хацелі прапанаваць!»

Сельсавет у апошні момант зьняў сваіх вылучэнцаў у Малым Сітне й Алёшчы па тых акругах, дзе зьбіраліся ісьці *народныя* ад леспрамгасу, чыгуначнай станцыі й сіценскай школы — і пачаў актыўна «акучваць» апошніх. Савецкая ўлада ўхілілася ад адкрытага супрацьстаяньня й зрабіла стаўку на перацягваньне апазыцыі.

Дзе ж рэвалюцыйны запал нашчадкаў бальшавікоў? Дзе спаборніцтва, прадугледжанае сыстэмай волевыяўленьня? Дзе тая падаўляючая сіла намэнклятуры, калі кавалак улады аддаецца бяз бою «чужым», якія толькі праявілі жаданьне?

Шкада толькі — тых ахвотнікаў аказалася замала, каб узяць у сельсавеце большасьць.

Праўда, старшыню дэпутаты ў нас выбіраюць толькі па *прадстаўленьні* райвыканкаму і ў выпадку, калі не прагаласуюць, сельсавет распускаецца — але паводзіны нізавое намэнклятуры ох якія паказальныя.

Савецкая ўлада ў вёсцы адмірае, гэта факт. Для Галіны Дзьмітрыеўны пытаньне ўжо ня ў тым, каб трымаць пад кантролем наваколье, а ў тым, як даседзець да пэнсіі.

Дом ля пагосту нагадвае сядзібу з прывідамі. Улада быццам бы ёсьць, а быццам і няма, і старшыня сельсавету *дама ў чорным* — пэрсанаж амаль легендарны: у хатах яе бачаць раз на некалькі гадоў, калі перад чарговымі «выбарамі» надыходзіць час зьбіраць у бабулек подпісы за Лукашэнку.

Дом ля пагосту паціху асядае й растрэскваецца. Так і ўяўляецца праз тыя чатыры гады каробка з пустымі вокнамі на ўзор «вымяральніцкага» інтэрнату, а потым і руіны, што паволі пераходзяць у могілкі.

Беларусі не патрэбны мёртвы сельсавет з прывіднай уладай і сцэнамі маўчаньня ў чаканьні рэвізора з вобласьці. Савецкая ўлада зрабілася *рытуальнай*. Беларусь памірае без жывога мясцовага самакіраваньня — са сходамі й дэбатамі, тэндэрамі й сапраўднымі выбарамі.

Беларусі патрэбная не стабільная магільная ціша, а нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

> Савецкая ўлада зрабілася *рытуальнай.*

## ХРОНІКА

гледзіць суд Фрунзэнскага раёну Менску.

### Міколу Статкевіча праслухоўваюць

**Лідэр БСДП (Народная Грамада) Мікола Статкевіч** паведаміў, што супрацоўнікі пухавіцкага раённага КДБ усталявалі на ягоным працоўным месцы прыстасаваньне для праслухоўваньня.

М.Статкевіч адбывае ў вёсцы Блонь Пухавіцкага раёну Менскай вобласьці пакараньне ў выглядзе абмежаваньня волі за арганізацыю масавых акцый пратэсту супраць фальсыфікацыі вынікаў парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму 2004 г.

### Эўрапейскія газэты патрабуюць вызваліць Казуліна

У польскай **«Gazecie Wyborczej»**, славацкай **«SME»**, чэскай **«Lidove Noviny»** ды літоўскай **«Lietuvos Rytas»** былі надрукаваныя адкрытыя лісты да сваіх урадаў з заклікам запатрабаваць ад беларускіх уладаў неадкладнага вызваленьня палітвязьня **Аляксандра Казуліна**.

### 15 сьнежня

### У Гародні адмовілі ў рэгістрацыі 13 сябрам АГП

У Горадні ад АГП зарэгістраваныя толькі два чалавекі — кіраўнік Гарадзенскай абласной арганізацыі АГП **Юры Істомін** і старшыня Гарадзенскай гарадзкой арганізацыі АГП **Зьміцер Слуцкі**. Яны зарэгістраваныя кандыдатамі ў дэпутаты Гарадзенскага абласнога савету дэпутатаў і Гарадзенскага гарадзкога савету дэпутатаў.

Астатнім 13 сябрам АГП адмовілі ў рэгістрацыі. Нагода — нібыта памылкі ў падатковых дэкларацыях і іншыя прычэпкі.

### 140 студэнтаў БДПУ выказаліся ў падтрымку звольненага выкладчыка

Больш за 140 подпісаў студэнтаў другога курсу гістарычнага факультэту ў падтрымку **Юрыя Бачышчы**, выкладчыка катэдры славянскай гісторыі БДПУ, былі перададзеныя ў суд і прыкладзеныя да справы аб аднаўленьні выкладчыка на працы. Ён быў звольнены пасьля прэзыдэнцкай кампаніі толькі за тое, што меў сьмеласьць быць назіральнікам на адным з выбарчых участкаў.

### Дашкевіч застанецца ў зьняволеньні

Менскі гарадзкі суд пакінуў бязь зьменаў рашэньне суду Кастрычніцкага раёну Менску, згодна зь якім лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту» Зьміцер Дашкевіч асуджаны на паўтара году зьняволеньня. Зьмітра арыштавалі сёлета 15 верасьня. 1 лістапада суд пакараў яго за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. Пакараньне З.Дашкевіч адбывае ў Шклоўскай папраўчай калёніі.

### У Гомелі незалежных кандыдатаў не рэгіструюць

Гомельская гарадзкая выбарчая камісія зарэгістравала кандыдатамі ў дэпутаты толькі пяць з дваццаці дэмакратычных актывістаў, якія высоўваліся кандыдатамі ў дэпутаты гарадзкога савету. Сярод іх — два сябры АГП, па адным — ад партыі БНФ,

**Працяг на старонцы 20.**

# Лідэру ТБМ з Баранавіч падкінулі патроны

У панядзелак, 18 сьнежня, па абедзе, да баранавіцкага грамадзкага актывіста Віктара Сырыцы завіталі тры міліцыянты і тры асобы ў цывільным.Ператрус у яго кватэры доўжыўся тры гадзіны.

Пастанову пра гэта падпісаў намесьнік пракурора Баранавіч сп. Бесан. Маўляў, скралі жаночую сумачку, і міліцыянты ладзілі рэйд па «падазроных кватэрах».

Падчасператрусу ў шафе была знойдзена скрыня з 20 баявымі патронамі. Сп. Сырыца катэгарычна адмаўляе сваю датычнасьць да яе: «Мая зброя — слова, а ня гэтыя здаровыя, блішчастыя патроны». Таксама ў яго былі канфіскаваныя два кампутарныя сыстэмныя блёкі, улёткі, перавыбарчая дакумэнтацыя.

В.Сырыцу адвезьлі ў Баранавіцкі РУУС, дапыталі як сьведку ў справе «зьнікненьня сумачкі» ды завялі крымінальную справу адносна захоўваньня патронаў. Увечары адпусьцілі дадому.

Сырыцу паведамілі, што крымінальную справу па факце захоўваньня патронаў будзе весьці старшы лейтэнант Карышаў. З панядзелка ніякіх новых фактаў у справе не зьяўлялася, на допыты актывіста таксама не выклікалі.

В.Сырыцу 53 гады, ён узначальвае Баранавіцкую суполку ТБМ, выкладаў гуманітарныя дысцыпліны ў эканаміч-на-юрыдычным каледжы, быў звольнены з працы за ўдзел у выбарчай кампаніі Аляксандра Мілінкевіча. Мяркуе, штоператрус і крымінальная справа — помста за ўдзел у кампаніі па выбарах у мясцовыя саветы дэпутатаў. «Я хоць сам і ня быў кандыдатам, але многа каму з кандыдатаў дапамагаў падчас гэтае кампаніі», — кажа ён.

**Зьміцер Панкавец**

## ХРОНІКА

**Працяг са старонкі 19.**

КХП–БНФ і ПКБ.

Астатніх дэмакратычных прадстаўнікоў адсеялі на падставе нібыта няпэўных зьвестак у дэклярацыях і анкетах, а таксама выяўленай значнай колькасьці несапраўдных подпісаў выбаршчыкаў.

### 16 сьнежня

#### Сьветлагорск салідарны з палітвязьнямі

У ноч на 16 сьнежня актывісты сьветлагорскае суполкі незарэгістраванага «Маладога фронту» правялі акцыю салідарнасьці са зьніклымі й палітзьняволенымі. У шматлюдных месцах гораду зьявіліся плякаты з надпісамі «Дзе Захаранка?», «Дзе Завадзкі?», «Дзе Ганчар?», «Свабоду Дашкевічу!», «Свабоду Казуліну!», «Свабоду Фінькевічу!» З раніцы сьветлагорцы ўбачылі на аўтобусных прыпынках, дошках аб'яваў партрэты зьняволеных і тых, хто зараз адбывае пакараньне па палітычных матывах.

#### Салідарнасьць з палітвязьнямі ў Баранавічах

А 20-й гадзіне баранавіцкая моладзь запаліла сьвечкі ў гарадзкім парку на знак салідарнасьці з асуджаным лідэрам «Маладога Фронту» **Зьмітром Дашкевічам**.

#### Віншаваньні палітвязьням

Увечары на пошце Цэнтральнага чыгуначнага вакзалу Менску адбылася акцыя салідарнасьці з палітычнымі вязьнямі Беларусі. Актывісты незарэгістраванага «Маладога Фронту» і сябры іншых арганізацыяў разам павіншавалі людзей, што знаходзяцца ў няволі за сваю палітычную пазыцыю.

Пры канцы акцыі перад галоўным уваходам у чыгуначны вакзал быў утвораны ланцуг салідарнасьці: маладыя людзі трымалі сьвечкі і партрэты палітвязьняў.

### 17 сьнежня

#### Салідарнасьць у Польшчы

У дзевяці гарадох Польшчы прайшлі акцыі салідарнасьці зь Беларусяй. Акцыі прайшлі ў **Кракаве**, **Любліне**, **Сопаце**, **Познані**, **Ўроцлаве**, **Лодзі**, **Беластоку**, **Пултуску і Варшаве**. Іх зладзілі беларускія студэнты, што вучацца на стыпэндыях імя Кастуся Каліноўскага.

#### У Баранавічах затрымліваюць моладзь

Уначы ў Баранавічах былі затрыманыя маладзевыя актывісты **Артур Сасім**, **Аляксандар Астроўскі** і **Яраслаў Грышчэня**. На хлопцаў былі складзеныя пратаколы за «распаўсюд друкаваных матэрыялаў без выходных зьвестак».

# Павіншуй палітвязьня з Калядамі



Яму цяпер цяжка. Твой ліст можа выратаваць яго.

211300 Віцебскі раён, пас. Віцьба, ВК №3, 1-шы атрад, **Казуліну Аляксандру**.

220079 Менск, вул. Кальварыйская, 36, ВК №1, **Дранчуку Цімоху**.
22 сьнежня стане вядомы дзень датэрміновага вызваленьня Цімоха. Сачыце за падзеямі — магчыма, удасца павіншаваць яго на волі.

211656 Віцебская вобласьць, Полацкі раён, п.а. Малое Сітна, вул. Лясная, 11, да запатрабаваньня, **Севярынцу Паўлу**.

213004 Магілёўская вобласьць, г. Шклоў, ВК-17, **Дашкевічу Зьмітру**.

212002 г. Магілёў, вул. Пушкіна, 65, ПУОТ №43, пакой 206, **Фінькевічу Артуру**.

247511 Гомельская вобласьць, Рэчыцкі раён, в.Баршчоўка, ВУАТ №22, **Клімаву Андрэю**.

222831 Пухавіцкі раён, вёска Блонь, **Статкевічу Мікалаю**.

211791 Віцебская вобласьць, Глыбокае-1, ВК-13, атрад №7, **Круку Івану**.

230023 г. Горадня, вул. Кірава, 1, турма №1, СІЗА, **Аўтуховічу Мікалаю**.

246035 г. Гомель, вул. Антошкіна, 3, ВК-4, **Садоўскай Кацярыне**.




# Беларускі рэпэр Кроў у нямецкім часопісе

Рэха беларускага рэпу дакацілася да Нямеччыны. Апошні нумар буйнога нямецкага хіп-хопавага часопісу «Backspin» прысьвячае цэлыя тры паласы лідэру гурта «ЧпБ», які выступае пад псэўданімам Кроў. Аўтар матэрыялу, Інго Пэтц, якому ад верасьня не даюць візы ў Беларусь, даходліва тлумачыць неабазнаным чытачам беларускую рэчаіснасьць. Ілюстрацыі для артыкулу зрабіў фотажурналіст «Нашай Нівы» Андрэй Лянкевіч.

Мова, бадай, галоўны інструмэнт рэпу. У Беларусі з мовай — праблема. Дзякуючы артыкулу нават самыя апалітычныя нямецкія падлеткі ў бэйсболках ды абвіслых джынсах даведаюцца пра тое, чаму ў Беларусі прыцясьняецца беларуская мова, і якое гэта мае дачыненьне да музыкі. Інакш кажучы, ненавязьлівая палітінфармацыя, якая, між тым, дае досыць глыбокае і, варта аддаць журналісту належнае, надзвычай дакладнае ўяўленьне пра жыцьцё беларускай апазыцыйнай моладзі. На думку аўтара, Кроў — не адзіны музыка пратэстнай хвалі, але ўнікальны паводле градусу палітызаванасьці сваіх тэкстаў.

**Алесь Кудрыцкі**

# Мельнікаў у гасьцях у Ваньковічаў

Пэсімістычныя маналёгі барда паміж песьнямі засмуцілі. Калі гэты адраджэнец расчараваўся ў жыцьці, то на каго раўняцца?

17 сьнежня ў Доме Ваньковічаў прайшоў канцэрт барда Андруся Мельнікава. Паслухаць нячастыя выступы Мельнікава сабралося чалавек трыццаць. Абраны ім плян творчай сустрэчы — расповяд аб жыцьці ў храналягічным парадку, пачынаючы з 1987 году — даў зразумець, што сьпявак хоча выказацца на публіцы. У Гомелі, дзе ён жыве, гэтага бракуе. Бард, якога ўяўляў значна старэйшым, прадстаў 41-гадовым мужчынам. Сьціплы, худыя рысы твару. Зусім не такі, як ягоныя песьні.

Імя Мельнікава ў пачатку 1990-х было на слыху. А як часы адраджэньня мінуліся, то пра спадара Андрэя забыліся. А яшчэ і турма. Справа аналягічная, па якой праходзілі Шарамет і Завадзкі. Калі пра апошніх гаварылі і пісалі ў прэсе, то пра барда маўчалі. Крыўдна было. Але той час шмат чаму яго навучыў.

Са сьпеваў Мельнікава, а таксама Сокалава-Воюша пачынаўся мой шлях да беларушчыны. Быў 1999 год. Толькі прайшлі альтэрнатыўныя выбары прэзыдэнта. У аднаго знаёмага пачуў «Продразьвёрстку» ў выкананьні Мельнікава. Стала сьмешна з гукаў трубы (так здавалася тады). А цяпер, на канцэрце, убачыў, што ніякая то была не труба — напружваньне зьвязак барда, і ўвесь сакрэт.

Пэсімістычныя маналёгі Андруся Мельнікава паміж песьнямі засмуцілі. Крыўдна стала за людзей. Калі гэты адраджэнец расчараваўся ў жыцьці, то на каго раўняцца. Чалавек, які бачыць навакольле не на прыкладзе менскіх вуліц, варты таго, каб да яго прыслухоўваліся.

**Сяржук Макарэвіч**


WWW.SVABODA.ORG

**Андрэй Мельнікаў на Крапівенскім полі. 8 верасьня 2006.**

## Робаты загаварылі па-беларуску

У Беларусі пры падтрымцы ЮНЭСКО створаная кампутарная праграма, якая сынтэзуе беларускае маўленьне і дазваляе сьляпым дзецям бесьперашкодна вывучаць родную літаратуру. Цяпер магчымае аўтаматычнае агучваньне любога беларускамоўнага тэксту ў электронным фармаце.

**БелТА**

## «Мастацкая літаратура» выпусьціла электроннае выданьне «Новай зямлі»

Да 125-годзьдзя з дня нараджэньня Якуба Коласа выйшлі ў электронным выглядзе паэма «Новая зямля» і трылёгія «На ростанях». Уступнае слова да твораў напісаў Міхась Мушынскі. На двух кампакт-плытках разьмешчаны таксама сэрыял Уладзімера Сулкоўскага «Радзіма Якуба Коласа» з 24-х карцін. Тэкст да сэрыялу — урыўкі з паэмы — падабрала ўнучка клясыка Вера Міцкевіч.

**БелТА**

## Расея ўзялася за беларускія яйкі

Незвычайную апэрацыю правялі днямі праваахоўныя органы Расейскай Фэдэрацыі. Апэратыўнікамі быў выяўлены і перакрыты нелегальны канал пастаўкі ў Маскву беларускага яйка. У рукі расейскіх і праваахоўчых органаў трапіла адразу некалькі грузавікоў зь яйкамі, прамаркаванымі на Аршанскай птушкафабрыцы, але без дакумэнтаў на іх вываз. У распаўсюджанай з нагоды службовай паперы ўказвалася, што незаконныя пастаўкі яйкаў зь Беларусі насілі сыстэматычны і некантраляваны характар і пагражалі эканамічным інтарэсам Расеі.

**Паводле «Ежедневника»**

## Агента Моніча не памяняюць на літоўскага дыплямата

Агенцтва BNS у пятніцу паведаміла: у Сойме Літвы разглядаецца магчымасьць вылучыць Альбінасу Янушку, які да нядаўняга часу быў дыплvolматам высокага рангу, дзяржаўную ахову ад магчымага перасьледу з боку беларускіх уладаў.

Перасьлед магчымы, бо А.Янушка нібыта браў удзел у падрыхтоўцы змовы супраць рэжыму А.Лукашэнкі ў сакавіку. А.Янушка,



WWW.LRS.LT

**Альбінас Янушка.**

былы сакратар МЗС Літвы, цяпер зьяўляецца дарадцам прэм'ер-міністра.

Паводле зьвестак BNS, Вільня атрымала намёкі зь Менску, што ў абмен на нядаўна затрыманага ў Літве падазраванага ў шпіянажы Сяргея Моніча беларускія ўлады «пакінулі б у спакоі» А.Янушку, але магчымасьць такога абмену была адхіленая на паседжаньні парлямэнцкага камітэту замежных справаў Літвы.

**Паводле радыё «Свабода»**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## У пятніцу пачалася Ханука

У дамах і на вуліцах жыдоўскіх кварталаў загарэліся рытуальныя ліхтарні — ханукіі. Сьвята адзначаецца ў гонар габрэйскага паўстаньня ў абарону сваёй веры і традыцыяў у II ст. да н.э. Гэтае сьвята доўжыцца да 23 сьнежня.

**МБ**

## Масава перапрадаецца жытло, пабудаванае за ільготныя крэдыты

Увядзеньне іпатэчнага крэдытаваньня ня спыніць росту цэнаў на жытло. Аб гэтым заявіў першы намесьнік міністра эканомікі Пятро Жабко, прэзэнтуючы 14 сьнежня ў Палаце прадстаўнікоў праект закону аб іпатэцы.

Ён адзначыў: цэны на жыльлё «тады будуць нармальныя, калі попыт і прапанаваньне яго ўраўнуюцца».

У часе дыскусіі дэпутаты ўзьнялі пытаньне перапродажу жытла грамадзянамі, нібы маючы патрэбу ў паляпшэньні жыльлёвых умоваў. За апошнія гады ў Менску перапрадалі больш як 600 тыс. м² жылля, пабудаванага з выкарыстаньнем ільготных 5-працэнтавых крэдытаў.

**Паводле БелТА**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## «Нэйра Дзюбэль» зьбеларусізаваў Прагу

У праскім клюбе «Млэйн» выступіў папулярны беларускі гурт з брутальнай назвай «Нэйра Дзюбель». Гурт запрасілі беларусы

Празе і іх чэскія калегі з арганізацыі «За свабоду Беларусі». Канцэрт прайшоў у атмасфэры, дзе праскія беларусы маглі пачувацца як дома. У залі луналі бел-чырвона-белыя сьцягі.

**Паводле радыё «Прага»**

## Фрыстайліст Рак непрытомны ў кітайскай больніцы

Дзьмітры Рак быў дастаўлены ў непрытомным стане ў мясцовы шпіталь, няўдала прызямліўшыся пасьля скачка. Мэдыкі канстатавалі ў беларуса кровазьліцьцё ў мозг. Беларусы адзіныя ў былым СССР дабіваюцца перамогаў у гэтым відовішчным, але рызыкоўным спорце.

**Паводле Telegraf.by**

## «Нарачанскі» і кобрынскія сыры — прадукты году

Названыя пераможцы IX Рэспубліканскага конкурсу «Прадукт году — 2006». Першыя месцы прысуджаны хлебу «Нарачанскі», шакаляду й цукеркам «Камунарка», пячэньню «Слодыч», дзіцячаму харчаваньню «Тонус», марожанаму «Каштан» і «Топ», малаку «Савушкін прадукт», сыру «Кобрынскія сыры», кілбасам і пяльменям Ваўкавыскага мясакамбінату, мясу птушкі «Пятруха» і «Фабрыка здароўя», яйкам «Першай мінскай птушкафабрыкі», муцэ «Лідская».

**Паводле БелТА**

## Беларусь імпартавала ў чатыры разы болей легкавікоў

У студзені-кастрычніку 2006 г. Беларусь імпартавала 16,4 тыс. легкавікоў, што ў чатыры разы болей, чым за такі самы пэрыяд 2005 г. Маюцца на ўвазе новыя аўтамабілі, увезеныя для продажу. Патрыманыя іншамаркі тут ня ўлічаныя.

Асноўнымі экспарцёрамі былі Нямеччына (30% агульнага коштавага аб'ёму), Японія (18%), Расея (12%), Францыя (10%).

Увоз фізычнымі асобамі павялічыўся ў параўнаньні з студзенем-кастрычнікам 2005 г. ў колькасным выражэньні на 5,7%, у коштавым — на 6,1%.

**МБ; Паводле БелТА**



AP

## За плячыма ў беларускага Дзеда Мароза будзе мех з 16 000 000 даляраў

Міністэрства гандлю плянуе зарабіць за кошт перадсьвяточнага ажыятажу 35 млрд руб. на 10 % болей, чым летась. Пра гэта паведаміў намесьнік міністра гандлю Вячаслаў Драгун. Кірмашы ў сьвяточныя дні (акрамя 1 студзеня) будуць працаваць да 18-й. Прадуктовыя крамы ды гіпэрмаркеты працавацьмуць да 23 гадзінаў у перадсьвяточныя, і з 10-й да 17-й у сьвяточныя дні.

Навагоднюю ноч у рэстарацыях і кавярнях правядуць каля 120 тыс. беларусаў, зь іх у Менску — 29 тыс. Сьвяточная ноч у гэтых установах працягнецца да 6-й ранку.

Шампанскага ў продаж пойдзе 4,5 млн пляшак. А «Камунарка» і «Спартак» нарыхтавалі 1,5 млн падарункаў коштам ад 5 да 90 тыс. руб.

Елкі будуць прадаваць за 9 — 15 тыс. Навінкай гандлю стануць блакітныя яліны ў цэбрыках за 32 тыс. руб.

Дарэчы, сёлета раздробны таваразварот вырас аж на 17,8%. Доля айчынных тавараў складае 79,7% (у тым ліку харчовых тавараў — 86,2%, нехарчовых — 70,5%).

**Сямён Печанко**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Працоўны дзень пераносіцца з 2 студзеня 2007 г. на 30 сьнежня 2006 г.

Працоўны дзень пераносіцца з аўторка 2 студзеня 2007 г. на суботу 30 сьнежня 2006 г. У адпаведнасьці з пастановай, арганізацыям даецца права з улікам спэцыфікі вытворчасьці ажыцьцяўляць перанос рабочага дня ў іншым парадку згодна з заканадаўствам.

**БелТА**

# Румынія абвесьціла камунізм злачыннай сыстэмай

У гіганцкі Палац Парлямэнту ў Бухарэсьце зьехаліся знакамітыя госьці з усяго сьвету. Прэзыдэнт Румыніі Траян Басэску запрасіў іх узяць удзел ва ўрачыстай сэсіі палатаў парлямэнту. Басэску афіцыйна асудзіў на ёй камунізм і прызнаў сыстэму злачыннай.

Сымбалічнага акту не было б, калі б у красавіку не была скліканая прэзыдэнцкая камісія па справах вывучэньня камуністычнай дыктатуры. Цягам дзевяці месяцаў 19 экспэртаў пад кіраўніцтвам прафэсара Ўладзімера Тысманяну рыхтавалі даклад пра вынікі пяцідзесяці год камуністычнага рэжыму ў Румыніі.

У першую такую камісію ў постсавецкай Эўропе трапілі паважаныя навукоўцы і грамадзкія дзеячы, сярод іх вядомы дысыдэнт і старшыня Таварыства былых палітвязьняў Канстанцін Тыку Думітрэску, стваральнік Мэмарыялу ахвяраў камунізму Ромулас Русан, а таксама праваслаўны мітрапаліт Нікалае Карняну – адзіны з румынскіх гіерархаў, хто прызнаўся ў супрацоўніцтве з камуністычнай дзяржбясьпекай.

Большасьць дасьледчыкаў, аднак, складалі маладыя навукоўцы. Даклад камісіі налічвае 650 старонак. У ім пералічваюцца асноўныя злачынствы рэжыму, а таксама зазначаецца адказнасьць асобных людзей і іх роля ў падзеях тых часоў.

**Вольга Данішэвіч паводле gazeta.pl**

# Гэткім злачынствам няма тэрміну даўнасьці

Румынія перажывае люстрацыю былых даносчыкаў «Сэкурытатэ». Піша **Ўладзімер Тысманяну**.

### Даносчыкі і афіцэры

У нас ідзе вайна супраць амнэзіі — і вельмі слушна. Гаварыць пра паляваньне на вядзьмарак — абсалютны нонсэнс. «Вядзьмаркі» былі невінаватымі кабетамі, якіх мучылі і нават забівалі. Даносчыкі ж актыўна дзейнічалі на баку Зла. Яны не пакаяліся ў належны час, а сёй-той зь іх нават пачаў граць ролю ахоўніка грамадзкай маралі ў новай сыстэме, гэтым самым ўдзельнічаючы ў распаўсюджваньні няпраўды.

Аднак распарадчыкамі Зла былі не даносчыкі, а афіцэры «Сэкурытатэ» і камуністычныя апаратчыкі — ідэолягі і кадравы склад.

Трэба толькі ацаніць, наколькі глыбока можна залезьці ў мінулае, і якімі былі б наступствы падобных «раскопак» — наколькі гэтыя дзеяньні будуць мець значэньне для канкрэтных людзей, а наколькі мы будзем проста чарговы раз блукаць у лябірынце падманлівых ценяў.

Ці абмяжуемся мы зацятымі атакамі на даносчыкаў, якія зацягнулі з публічнай самакрытыкай? Ці мы спусьціліся нагэтулькі глыбока, каб дакрануцца да той неўпарадкаванай нармальнасьці, якая спадарожнічае штодзённым міжчалавечым сыстэмам? Ці мы зноўку будзем нівэляваць адказнасьць толькі дзеля таго, каб уратаваць таго ці іншага чалавека, які выклікае нашую сымпатыю?

Скандал вакол даносчыкаў не павінен засланіць найвялікшую ганьбу — тое, што «Сэкурытатэ» была прыладай тэрору ў руках камуністычнай дыктатуры. Даносчыкі працавалі на афіцэраў, тыя ж былі партыйнымі дзеячамі, адкамандзіраванымі ў тайную паліцыю. Гэткая змрочная інстытуцыя, як «Сэкурытатэ», грунтавалася на кантролі з боку Румынскай камуністычнай партыі. З усяго збору архіўных дакумэнтаў вынікае, што менавіта партыя мела ўладу над тайнай паліцыяй, а не наадварот. Усе злачынствы супраць чалавецтва ўчыняліся ў імя ідэалягічных наказаў, тыя ж вынікалі з утапічнага бачаньня, разьвіцьцю якога спрыяла Румынская камуністычная партыя. Студэнтаў і інтэлектуалаў перасьледавалі, беручы пад увагу патрэбы партыі, якая мела кантраляваць духоўнае жыцьцё і адбіць усялякую спакусу крытыкі.

### Сетка хлусьні

Ніхто ня будзе аспрэчваць, што ўжо



**Уладзімер Тысманяну** —

прафэсар паліталёгіі ўва Унівэрсытэце Мэрылэнд, аўтар кнігі «Stalinism for All Seasons: A Political History of Romanian Communism» («Сталінізм на кожны сэзон. Палітычная гісторыя румынскага камунізму») (University of California Press). У красавіку 2006 г. прэзыдэнт Траян Басеску прызначыў яго кіраўніком Прэзыдэнцкай камісіі па справах вывучэньня камуністычнай дыктатуры ў Румыніі. 600–старонкавы заключны рапарт камісіі разам з высновамі будзе прэзэнтаваны прэзыдэнтам Басеску на спэцыяльным паседжаньні румынскага парлямэнту 18 сьнежня 2006 г.



**Маніфэстацыя 1988 году. Праз год Чаўшэску ня стане.**

Партыя мела ўладу над тайнай паліцыяй, а не наадварот.

час раскрыць дасье ўсіх цяперашніх кіраўнікоў дзяржавы і ўсіх палітыкаў. Нам патрэбная абсалютная празрыстасьць і поўная праўда. Цяперака сетка хлусьні ўсё больш душыць, мы блукаем у густой імгле, а стан маральнай разгубленасьці робіцца крыніцай цынізму, боязі і роспачы. У гэткай атмасфэры няпэўнасьці выдатна пачувае сябе папулізм і іншыя дэмагагічна-аўтарытарныя спакусы. Дэмагогі ахвотна і без асаблівых высілкаў скарыстоўваюць такую сытуацыю дзеля ўласных згубных мэтаў.

## Пачуцьце меры

На месцы тых, кім некалі захапляліся, мы сёньня бачым маральныя руіны. Адзін мой блізкі сябра, прафэсар гісторыі ў Цэнтральнаэўрапейскім унівэрсытэце ў Будапэшце і важная постаць у румынскай грамадзянскай супольнасьці, прызнаўся публічна, што на мяжы 70-х і 80-х гг. супрацоўнічаў з тайнай паліцыяй у якасьці даносчыка.

Аднак ня ўсе супрацоўнічалі, ня ўсе верылі, што сыстэма будзе трываць вечна. Для мяне стукацтва, альбо, як кажуць французы, délation — справа глыбока непрыстойная. Уваходзіць у жыцьцё нейкага чалавека, каб пасьля, ня маючы на гэта ніякіх правоў, складаць пра яго данясеньне. Падпісаць абавязацельства на супрацоўніцтва — грэх, але захоўваньне гэтага факту да ўласнага ведама толькі пагаршае справу. Шмат, аднак, залежыць ад таго, каму робяцца справаздачы. Даносчыкі працавалі з афіцэрамі, ня зь іншымі даносчыкамі. Выкрыцьці апошніх месяцаў і ўспышкі маральнай самазадаволенасьці, што спадарожнічалі ім, пагражаюць стратай пачуцьця меры. Адна справа агіда, а іншая — пераканананьне, што мы маральна зганьбаваныя на вякі.

## Дзьве «Сэкурытатэ»?

Кажучы коратка, маральная празрыстасьць патрэбная нам, як паветра і вада. Менавіта так павінен гучаць галоўны лёзунг цяперашніх дэбатаў: трэба пазьбягаць ўсялякага прыхарошваньня праўды, трэба мець адвагу і сьвядомасьць, што мінулае ня зьнікне. У Румыніі, гэтак жа, як і ў іншых посткамуністычных краінах ранейшага савецкага блёку, мінулае ня ёсьць перагорнутай старонкай. «Сэкурытатэ» была злачыннай тэрарыстычнай арганізацыяй з пачатку і да апошняга дня свайго існаваньня.

Надта часта мы чуем, што ў гісторыі «Сэкурытатэ» было два пэрыяды, і што сапраўды агідным быў першы, камінтэрнаўска-камінфармоўскі (1948-64). У тыя часы, як кажуць, кіравалі «чужыя», г.зн. жыды і вугорцы. Чамусьці нікога не цікавіць, што міністрам унутраных спраў і найвышэйшым начальнікам «Сэкурытатэ» у 1952-65 гг. быў румын Александру Драгічы, а ягоным папярэднікам, які ў 1952 г. стаўся ахвярай чысткі разам з Анай Паўкер, — Тахару Гэоргэ, таксама

Працяг на старонцы 26.

# Гэткім злачынствам няма тэрміну даўнасьці



**Каб дабіцца адкрыцьця архіваў Сэкурытатэ, румынам спатрэбілася 17 гадоў.**

**Працяг са старонкі 25.**

румын.

Згодна з гэтай жа легендай, у другі пэрыяд (1965-89) тайная паліцыя служыла нацыянальным інтарэсам. Прынамсі, так сьцьвярджаюць былыя афіцэры «Сэкурытатэ» і іх цяперашнія пасьлядоўнікі. Адным з вестуноў гэтай канцэпцыі зьяўляецца Карнэлію Вадзім Тудор, кіраўнік ксэнафобскай Партыі Вялікай Румыніі, былы кандыдат у прэзыдэнты, а ў свой час афіцыйны трубадур Чаўшэску і ягонай дыктатуры. Колькі месяцаў таму Тудор прадэманстраваў выключную фанабэрыю, адкрыта запрашаючы ўсіх былых супрацоўнікаў «Сэкурытатэ» у сваю партыю.

## Год 2006: хітрыкі

Неабходна аказваць жорсткае супраціўленьне усё больш моцнаму нацыяналістычна-шпегаўскаму дыскурсу, што рэабілітуе «патрыятычную» «Сэкурытатэ». Здушэньне бунту гарнякоў у Даліне Джыў у 1977 г., перасьлед Паўла Гомы і ягонага руху абароны правоў чалавека, разгон дэманстрацый у Брашаве ў лістападзе 1987 г., забойства інжынэра Гэоргэ Урсу, які правініўся адно тым, што ў асабістым дзёньніку пісаў пра шаленствы Чаўшэску, замахі на жыцьцё вядомых румынскіх эмігрантаў, расправы ў сьнежні 1989 г., — усё гэта неаспрэчна даказвае, што «Сэкурытатэ» была злачыннай арганізацыяй.

Адмаўляюць гэта людзі, для якіх выкрыцьцё камунізму як ладу, што грунтуецца на злачынствах супраць чалавецтва, уяўляе небясьпеку. Пра гэтыя злачынствы трэба памятаць без баязьлівасьці, якую дыктуе сорам.

> Даносчыкі, якія супрацоўнічалі пад ціскам шантажу ці ад апартунізму, былі вінцікамі пякельнай машыны, якую легітымізавалі іх уласныя гідкія кампрамісы.

## Віна віне ня роўная

Трэба выслухаць з належнай пашанай голас пацярпелых. Калі б не даносчыкі, «Сэкурытатэ» не была б у стане функцыянаваць. Таму нам і патрэбныя паказаньні — дзеля таго, каб такія трагедыі больш не паўтараліся, і каб мы маглі глядзець у вочы нашым сябрам. Трэба захаваць спакой і задумацца, што мы зрабілі за апошнія 16 год. Правіннасьці бываюць рознымі, адказнасьць таксама.

Такім чынам, кіраўнікі камуністычнай партыі былі галоўнымі віноўнікамі румынскага тэрору, а яго выканаўцамі былі «Сэкурытатэ», кіраўніцтва замежнай разьведкі, а таксама міліцыя. Нядаўна аднаму з партыйных вэтэранаў, экс-прэм'еру Мані Манэску, споўнілася 90 год. Нацыяналісты зладзілі яму ўрачыстае сьвяткаваньне як вялікаму дзяржаўнаму дзеячу. У каго з нас гэтая сцэна выклікала агіду? Чаму ніхто гучна не запратэставаў? Ці ж мы былі гэтак занятыя выкрыцьцём дэмакратычных дзеячоў як былых даносчыкаў, што ўжо забыліся, хто сапраўды вінаватыя ў румынскай трагедыі?

## Хвіліна праўды

Пішу пра гэтыя нюансы, каб падкрэсьліць, што віноўнікаў трэба абвінавачваць у адпаведнасьці зь іх сапраўднай адказнасьцю. Некаторыя супрацоўнічалі, а пасьля маўчалі ці зусім ігнаравалі значэньне гэтага супрацоўніцтва. Іх паводзіны вартыя жалю. Але гэта не яны аддавалі загады. Такія людзі, як той вышэйзгаданы былы прафэсар Цэнтральнаеўрапейскага ўнівэрсытэту, супрацоўнічалі пад ціскам шантажу ці ад вартага шкадаваньня апартунізму, былі вінцікамі пякельнай машыны, якую легітымізавалі іх уласныя гідкія кампрамісы і ганебныя капітуляцыі. Аднак сама інстытуцыя мела свае аддзелы і пададдзелы, адзінкі і пададзінкі.

Менавіта тым і была «Сэкурытатэ» (унутраная і замежная) — змрочнай інстытуцыяй, мэтай якой быў тэрор, кантроль, нагнятаньне страху. Як у краіне, так і ў колах палітычнай эміграцыі. Усе прыёмы былі ёй дазволеныя. Паўтарэньне гэтай праўды — грамадзянскі, палітычны і маральны абавязак. Адрозьненьне жыцьця ў праўдзе ад псэўдажыцьця ў хлусьні — вялікая навука ўсходнееўрапейскіх апазыцыянэраў. Час ужо, каб і ў Румыніі гэтая розьніца перастала быць пустым словам.

Загаловак ад Рэдакцыі. У арыгінале: «Патрэба маральнай празрыстасьці»

**Пераклала Вольга Данішэвіч паводле http://serwisy.gazeta.pl/swiat/1,34250,3776753.html**

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**

# Сьнег

## З кнігі «Сто лі100ў на tut.by»

@ @ @
Зранку ў падворку зьявіцца сьнег,
новы, як бібліятэка,
белы і ліпкі, нібы пельмень,
як яго ні круці.
Зранку ў падворку стануць ляпіць
сьнежнага чалавека.
Дворнікі будуць лаяцца матам:
«Маць тваю, еці, еці!»

Зранку першым, блін, комам
нас расстраляюць дзеці!
Нехта ў белай гарачцы
белы збудуе дом.
Дворнікі будуць рыпець на машынах:
«Вы паглядзеце!
Еці!»,
крэсьлячы адрас на шкле лабавым:
www.sniezhny.com.

@ @ @
Выйдзеш на вуліцу — вецер гвалтуе дзяўчатак.
Вушы прадзьме — і гамон, і камэдыі фініш.
Галасаваць не ідзі, безнадзейны занятак:
Як ні старайся, ніводнай машыны ня спыніш!

Трэба ляцець, ды стаіш на халодным прыпынку.
Цокаюць сківіцы, кожная — нібы падкова.
Цяжка пасьпець, як ня зробіш сапраўднага ўчынку.
Колаў няма, а на крылах — прадзьме канчаткова.

@ @ @
Сьнег ідзе. Галубы. Не блакітны, а — галубы
За акном натапырылі пёры, нібы забойцы.
Ля аконнай шыбы школьныя ўжо лабы
Падзяляюць сьвет: тут — «індзейцы», а там — «каўбойцы».

У лабоў мукі творчасьці: алавяны стойкі жаўнер
Праз два «н» упарта ня пішацца ў першай прозе.
Сьнег ідзе — і, трапляючы коміну за каўнер,
Абганяе трамваі і ўсіх, каму па дарозе.

# Першая кніжка сэрыі «Кнігарня «НН»




@ @ @
Будучы сьнег яшчэ сёлета выпадае
Цукрам у каве, і люд выпадае ў асадак.
Вырак законны, і скардзіцца не выпадае.
Побач шыбуе жвавая й маладая,
Толькі пад футрам цяжэй разгледзець азадак.

Дзеўка–зіма прыйшла белатварай марай
І цалуе ўзасмак белазубай згубай.
Дзьве сьцяжынкі сыходзяць у лес закаханай парай.
Дыхаеш ім наўздагон халодную парай
І задыхаесься, як селядзец пад шубай.

**Няма часу сумаваць —**
**Зараз будзем маляваць.**







**На адной карціне — ружы.**
**Гэта — нацюрморт, мой дружа!**



**На карціне — горад наш.**
**Гэта — гарадзкі пэйзаж!**



**Вось партрэт перад табой,**
**Гэта — добры сябар мой!**



Капітан Танака ©



**Па гарызанталі: 1.** Яго водзяць вакол елкі. **8.** Упартая жывёліна з доўгімі вушамі. **11.** Лішні клопат, узвалены на плечы. **12.** Прылада для капаньня зямлі. **15.** Хата ў народаў крайняй Поўначы. **16.** Нашчадак людзей розных расаў. **17.** Амэрыканскі філёзаф XX ст., праславіўся «Структурай навуковых рэвалюцый». **18.** Шчыпковы інструмэнт. **19.** Мястэчка, дзе, паводле ідыш-фальклёру, жылі найвялікшыя «мудрацы». **21.** Пашпарт ці дакумант увогуле (арго). **23.** Літара грэцкага альфабэту. **25.** У старажытных грэкаў — багіня зямлі. **26.** Лётчык — майстар сваёй справы. **28.** Узнагарода для пераможцы турніру. **29.** Статак бараноў. **30.** Пачатак, але не «ARCHE». **32.** Шумнае непаразуменьне, напр., паміж А. Фядутам і П. Садоўскім. **34.** Ёю часам сканчаюцца канфлікты. **36.** Марудлівы чалавек (перан.). **38.** Сучасны расейскі сатырык. **40.** Яна — у падручніках «дзяржаўнай ідэалёгіі». **42.** Францускі навуковец XVIII ст., вынаходнік тэмпэратурнай шкалы. **43.** Сукупнасьць правілаў, перадусім царкоўных.

**Па вертыкалі: 1.** Човен у эскімосаў. **2.** Настольнік. **3.** Горад на Сене. **4.** Францускі шансаньe армянскага паходжаньня. **5.** Чарнаморскі курорт у Абхазіі. **6.** Кароль Нарвэгіі (XI ст.). **7.** Сталіца Сірыі. **9.** Хацінка ў Альпах. **10.** Жорсткі прыгнятальнік, карнік. **13.** Мядзьведзік, сябар парасяці. **14.** Тып спадарожнікавай антэны (разм.). **20.** Прырэчная расьліна з моцным водарам. **21.** Герой апавесьці Зьмітрака Бядулі «Салавей». **22.** Яна апаноўвае п'янчужак. **23.** У фільме пра Штырліца яго звалі Шлаг. **24.** Паўночны порт на рацэ Енісей. **25.** Аматар добра пад'есьці. **27.** Колькі гадоў споўнілася «Нашай Долі» і «Нашай Ніве»? **31.** Кітайская імпэратарская дынастыя VII–X стст. **33.** Лясны драпежнік-санітар. **35.** Аповесьць Элізы Ажэшкі. **37.** Філямат Тамаш … **39.** Нота ў музычнай гаме. **41.** Беларускае возера, што побач з цэнтрам Эўропы.

**Склаў Вольф**

**Адказы**

**Па гарызанталі: 1.** Карагод. **8.** Ішак. **11.** Абуза. **12.** Лапата. **15.** Яранга. **16.** Мулат. **17.** Кун. **18.** Арфа. **19.** Хелм. **21.** Ксіва. **23.** Псі. **25.** Гея. **26.** Ас. **28.** Кубак. **29.** Гурт. **30.** Старт. **32.** Сварка. **34.** Поўха. **36.** Тормаз. **38.** Арканаў. **40.** Каша. **42.** Рэамюр. **43.** Канон.

**Па вертыкалі: 1.** Каяк. **2.** Абрус. **3.** Руан. **4.** Азнавур. **5.** Гагра. **6.** Олаф. **7.** Дамаск. **9.** Шале. **10.** Кат. **13.** Пух. **14.** Талерка. **20.** Мята. **21.** Каспар. **22.** Ікаўка. **23.** Пастар. **24.** Ігарка. **25.** Гурман. **27.** Сто. **31.** Тан. **33.** Воўк. **35.** Хам. **37.** Зан. **39.** Рэ. **41.** Шо.

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

### Прэзэнтацыя «Ваеннай гісторыі беларускіх земляў»

У чацьвер, **21 сьнежня, а 17-й**, у Музэі гісторыі беларускай літаратуры на вул.Багдановіча,13 адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Ягора Новікава «Ваенная гісторыя беларускіх земляў да канца XII стагодзьдзя». Асноўным прадметам працы зьяўляецца вайна як найважнейшы фактар палітычнай гісторыі. Дасьледаваньне аналізуе розныя бакі вайны і можа быць цікавае як аматарам гісторыі, так і ўсім занятым палітыкай і ваеннай справай. Аўтар разглядае імкненьне людзей да палітычнай магутнасьці ў якасьці аднаго з асноўных рухавікоў гісторыі і прасочвае эвалюцыю вайны ад інструмэнту ў барацьбе за магутнасьць да самадастатковага фактару гісторыі.

Храналягічна дасьледаваньне абдымае так званы «далітоўскі» пэрыяд беларускай гісторыі, які цягнецца ад мяжы V–VI ст. да канца XII ст. Першы том дасьледаваньня вабіць чытача ў малавядомыя «цёмныя» стагодзьдзі беларускай ваеннай гісторыі. Нашаму воку адкрываецца плынь славянаў на беларускія землі, якая была водбліскам падзеньня Рымскай імпэрыі і Вялікага перасяленьня народаў.

## КАНЦЭРТ

### Кася Камоцкая

**28 сьнежня** на Управе БНФ (Машэрава, 8) адбудзецца канцэрт Касі Камоцкай. **Пачатак у 19:00.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВА

### Георгі й Натальля Паплаўскія

**22 сьнежня а 17-й** у Нацыянальным мастацкім музэі (вул.Леніна, 20) пройдзе адкрыцьцё пэрсанальнай выставы Георгія і Натальлі Паплаўскіх. Будуць паказаныя 60 жывапісных і графічных прац мастакоў. Выстава працуе да 22 студзеня.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 23 сьнежня

**«Лад», 16.50**

«Шэрбурскія парасоны» (Les Parapluies De Cherbourg).

Францыя, 1964, рэж. Жак Дэмі.

Мэлядраматычны м'юзыкал.

Пекная гандлярка парасонамі (Катрын Дэнёў) закахалася ў мэханіка, а яго забралі ў войска. Гераіня даведваецца, што цяжарная, але пад ціскам маці выходзіць замуж за багатага ювэліра. Праз колькі гадоў героі выпадкова сустракаюцца...

Мэлядраматычная гісторыя зачаравала сьвет. Музыка Мішэля Леграна й Нормана Жымбэля зажыла асобным жыцьцём.

**БТ, 19.10**

«Якая дзіўная гульня» (Какая чудная игра).

Расея, 1995, рэж. Пётар Тадароўскі.

Трагікамэдыя.

1951 год. Студэнты-кіношнікі блазнуюць: інсцэнуюць «варожыя радыёперадачы» з-за мяжы. Героямі забугорных галасоў становяцца суседзі па інтэрнаце. Жартам зацікавіліся органы…

Пётар Тадароўскі зрабіў пранізьлівую лірычную карціну пра сваё пакаленьне, расстралянае ў апошнія прымаразкі.

**«Лад», 21.10**

«Матч пойнт» (Match Point).

Вялікабрытанія—ЗША—Люксэмбург, 2005, рэж. Ўудзі Ален.

Драма.

Шэдэўр амэрыканскага кінаклясыка, які прымушае ўзгадаць Дастаеўскага й Драйзэра. Каб зрабіць кар'еру зь нялюбаю, але багатаю жонкай, герой стужкі забівае сваю палюбоўніцу...

### Нядзеля, 24 сьнежня

**СТВ, 20.45**

«Каляс назаўжды» (Callas Forever).

Італія—Францыя—Гішпанія, 2002, рэж. Франка Дзэфірэлі.

Драма.

Гісторыя опэрнай дзівы Марыі Каляс.

**Андрэй Расінскі**

# Дзякуй за ахвяраваньні

**Радзіму Г., Арсеню Л., Ксеніі Р., Віктару К., Уладзімеру Г., Рыце Н., Н.Б., В.М., Зьмітру Б., Раісе Б., Ірыне В., В.К., Віталю С., Віталю С., Ірыне Л., Кацярыне Я., Аляксандру Ц., Вользе Х., Уладзімеру Дз., Але К., Аляксандру С., Алене Л., Аляксандру К., Аляксею В., Міхаілу З., Ніне К., Тацяне Н., Сьвятлане Ш., Вользе С., Сьвятлане В., Аляксандру А., Н.Ю., Андрэю Ю., С.Ш., Паўлу Ч., Уладзімеру В., Барысу А., Н.З., П.З., В.К., П.З., Т.П., А.Л., Паўлу І., Генадзю Ц., Віктару Г., Марату К., Міхаілу Л., Багуславу У., С.Я., Паўлу П., Сямёну Л., Л.І., Пятру Т., Валянціне В., Аляксандру С., Уладзімеру Б., Алесю К., Г.Б., Юрыю Ш., В.Г., Л.П., Марыне П., Л.Г.** зь Менску.

**Уладзімеру П., С.З.** з Воршы і Аршанскага раёну.

**Леаніду Я.** з Пухавіцкага раёну.

**Антону Т.** з Жодзіна.

**Алене Г., Зоі Д.** зь Менскага раёну.

**Т.Б., Юр'ю П., Андрэю Ю.** з Магілёва.

**Вользе Б., Г.Я.** са Сьветлагорску.

**Эдуарду М., Яўгеньні К.** зь Віцебску.

**Зьмітру Ж., Алегу М.** з Гомеля.

**Уладзімеру В., Ніне Б.** з Кобрынскага раёну.

**Эльвіры Х., Івану А., Івану А., Віктару Л., Міраславу П., Аляксандру А.** з Горадні.

**Міхаілу Г.** зь Берасьця.

**Мікалаю К., Марыі М., Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.

**Зьмітру Ш., Алене Х., М.К., Міхаілу А.** з Наваполацку.

**А.К.** з Маладэчна.

**Сяргею У., Яўгену Ф.** з Бабруйску.

**Міхаілу С.** са Слуцку.

**П.Г.** з Мастоўскага раёну.

**Алесю Б., Анжэле Б., Руслану Г., Б.В.** з Баранавічаў.

**Галіне Ю., Антону Б.** з Верхнядзьвінскага раёну.

**Адзе Р.** з Шаркаўшчынскага раёну.

**Алене Дз.** з Наваградзкага раёну.

**В.Н.** з Барысава.

**Сяргею І., М.В.** з Салігорску.

**Яну Г.** з Гарадзенскага раёну.

**Г.Б.** са Сьветлагорскага раёну.

**Уладзімеру Д.** з Мазыра.

**Канстаціну К.** з Рэчыцы.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3015 212 000 012** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3015 212 000 012** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 36000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Прадказальны апакаліпсіс

**Апакаліпсіс** (Apocalipto).

ЗША, 2006, каляровы, 139 хв., з субтытрамі.

**Рэжысэр:** Мэл Гібсан.

**Ролі выконваюць:** Рудзі Янглблад, Далія Эрнандэз, Джонатан Бруэр.

**Жанр:** прыгоды, эксплюатацыйны фільм гвалту.

**Адзнака:** 4 (з 10).

Імпэрыя індзейцаў мая наконадні заваёвы гішпанцамі. Мірна праводзіць свае дні трапічнае племя. Але ваяры мая нападаюць на вёску і забіраюць людзей у палон. Герой стужкі — Лапа Ягуара — пройдзе пакутлівы шлях да сталіцы імпэрыі, будзе кінуты на паганскі аўтар і ўцячэ ў джунглі, каб ратаваць сябе й сям'ю.

Гісторыя гібсанаўскага «апакаліпсісу» разгортваецца надзіва прадказальна: тут выскачыць пантэра, зараз заб'юць нягодніка — а цяпер у ляндшафце мусіць быць вадаспад.

Сцэнарная банальнасьць маскуецца сэнсацыйнасьцю тэмы, этнаграфічнымі сцэнкамі і глыбакадумнымі намінкамі на ідэю.

Уся карціна здымалася на забытай мове індзейцаў, і саміх герояў граюць індзейцы. Старанна аднаўляецца дакалюмбаў побыт: шнары, фарбы, адзеньне, абсыдыян.

Татуіроўкі ваяроў, абсыпаныя белым рабы, выпэцканыя ў блакітнае ахвяры. (Грым стужкі заслугоўвае найвышэйшае пахвалы.)

Відовішчная масоўка ля капішча, жрацы... Але ўсё просталінейна. Калі этнаграфія не кранае, Гібсан выплюхвае на экран мяса й кроў. Зьедзеныя сырымі геніталіі тапіра (самае бязьвіннае), выдранае чалавечае сэрца, галава, што коціцца па прыступках. Натуралізм зашкальвае.

Але стужка Гібсана — не банальны фільм жахаў, дзе такое глядзіцца натуральна. Гэта фільм з прэтэнзіяй на ідэю. З аўтарскім пасланьнем. Праўда, прасьценькім: вялікія цывілізацыі струпянелі знутры — і цяпер час падобны. Каб пасланьне дайшло, Гібсан карыстаецца лабавымі мэтадамі цукарна-крывавага глямуру.

Спрошчанасьць разам з сэнсацыйным этнаграфізмам і крывёю гарантуе касу.

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТРЫ

**Опэра**

*на сцэне Цэнтральнага Дому афіцэраў*

**22 (пт)** — «Трубадур»
**28 (чц)** — канцэрт «Штраўс-гала»
**4 (чц)** — «Пітэр Пэн»
**6 (сб)** — «Князь Ігар»

**Купалаўскі тэатар**

**22 (пт)** — «Чычыкаў»
**23 (сб), 24 (ндз)** — «Чорная панна Нясьвіжу»
**26 (аўт)** — «Ажаніцца — не жырыцца»
**29 (пт)** — «Дзіўная місіс Сэвідж»
*ранішнія спэктаклі*
**26 (аўт), 29 (пт)** — «Афрыка»
**27 (ср), 30 (сб)** — «Сьнежная каралева»
**28 (чц)** — «Паўлінка»

**Тэатар беларускай драматургіі на сцэне РТБД**

**23 (сб)** — «Адвечная песьня»
**24 (ндз)** — «Адэль»
**26 (аўт)** — «Ганна ў тропіках»
**27 (ср)** — «Шлях у Царград»
**28 (чц)** — «Містэр Розыгрыш»
**29 (пт)** — «Нязваны госьць»

**Тэатар юнага гледача**

**23 (сб), 24 (ндз), 26 (аўт), 27 (ср), 28 (чц), 29 (пт), 30 (сб), 2 (аўт), 3 (ср), 4 (чц), 5 (пт), 6 (сб)** — «Спадарыня Завіруха»

**Калядная сярэднявечная дыскатэка**



**25 сьнежня** «Стары Ольса» запрашае на калядную сярэднявечную дыскатэку. Клюб «Арэна» (вул.Талбухіна, 4).

## НАШЫ ШАШКІ

# Пра стаўрапольскія шашкі

Я пачынаў як шахматыст, аднак паступова захапіўся шашкамі, навучыўшыся іх самастойна, паводле літаратуры. Працуючы трэнэрам, прыйшоў да высновы, што шашачная гульня лепш адпавядае нашаму хуткаплыннаму часу — максымум за год шашыст-пачатковец дасягае добрых вынікаў. У мяне палова вучняў безь вялікіх цяжкасьцяў выконвае норму другога разраду, другая палова — першага.

Існуе безьліч відаў шашак. У Беларусі практыкуюцца перадусім «рускія» і «міжнародныя», а ёсьць яшчэ бразыльскія, армянскія, неўскія, турэцкія. Як на мяне, найбольш практычнай разнавіднасьцю ёсьць стаўрапольскія шашкі, чый вынаходнік невядомы. У параўнаньні з рускімі дадаецца ўсяго адно правіла: кожны з гульцоў замест ходу сваёй шашкай заўсёды можа зьдзейсьніць ход за суперніка. Натуральна, сунуць чужыя простыя шашкі можна толькі ў свой бок, і біць імі інтарасант мае толькі «сваіх». Біцьцё абавязковае. У эндшпілі часта даводзіцца гуляць чужымі шашкамі, каб аслабіць іх пазыцыю.

Стаўрапольскі варыянт — дзіўнае спалучэньне элемэнтаў паддаўкоў і звычайных шашак. Праз гэта характар барацьбы рэзка ўскладняецца. Я праверыў: мысьленьне дзяцей пры ўжываньні ў пэдагагічным працэсе гэтай гульні разьвіваецца хутчэй, бо ім абавязкова даводзіцца думаць і за сябе, і за суперніка. Рэкамэндую!

**Аляксандар Паўловіч,**
**Трэнэр-выкладчык СДзЮШАР-11,**
**Менск**

### Ваш ход

Белыя пачынаюць і выйграюць паводле правілаў стаўрапольскіх шашак.



**Адказ:** 1. c5–b4! Чорныя мусяць біць: 1. ...a3:c5. Белыя зноў рушаць чужую шашку: 2. b8–c7! і ўзнікае пазыцыя, дзе любы ход чорных — хоць сваёй, хоць чужой шашкай — вядзе да страты.




Нашаніўскі каляндар з фатаздымкамі Андрэя Лянкевіча і Юліі Дарашкевіч
Шукайце ў незалежных распаўсюднікаў і на www.knihi.net

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**З Слуцкага павету.** Пад восень гэтага году ў мястэчка Раманава прыходзіў неякі сацыяліст. Было гэта ў нядзелю. Як толькі людзі пачалі варочацца з царквы дадому, ён ўлез на слончык і пачаў гаварыць аб усіх крыўдзіцелях працуючага народу. Мужыкі ўпадабалі, што гаварыў той чалавек, пачалі слухаць яго і нават вельмі ахвотна бралі ад яго неякія пісулькі (пасьля гаварылі, што гэта праклямацыі). Урадник, шпаркі гэтакі, хацеў зразу арыштаваць сацыяліста, але не, не ўдалося: мужыкі не далі, ды яшчэ нават за каўнер ураднiку наклалі.

«НН». 1906. № 5.

# А ты падпішыся!




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 30.**

Віншуем сям'ю Будкіных з нараджэньнем дачушкі.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую беларусаў** з Раством Хрыстовым і Новым годам! Шчасьця і дабрабыту вам! Рыгоравіч

**Віншую ўсіх** з 2007 годам! Хай сёлета агонь выкрые дзею кожнага! Б.Г.

**Viasiołych kaliadau i ščaślivaha Novaha hodu** zyču Tvajoj siamji, Natalka. Adhuknisia. Siabar

### БАТЛЕЙКА

**Каляды** на носе — батлейка напагатове — лялькі пашыхтаваўшыся! Сустрэньма іх ня горай ад продкаў! Т.: 247–13–40. Запрасеця пана Скіргайлу. E–mail: skirwill@yahoo.com

### КНІГІ

**Беларускія кніжкі** ў падарунак на Каляды і Новы год на кніжным кірмашы па вул. Янкі Купалы, 27

**Прапаную кнігі**: Насовіч «Слоўнік беларускай мовы» факс. 1870 г, Туронак «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», «Беларускі кнігазбор»: Баршчэўскі, Каліноўскі, Гётэ, Філяматы і філярэты, «Энцыклапэдыя гісторыі Беларусі» 1, 2, 5 т, Ластоўскі «Беларуска(крыўска)–расейскі слоўнік» факс. 1924 г ды шмат іншага. Т.: 753–70–05

### ПРАЦА

**Шукаю** адміністратара для працы з сайтам. Т.:771–49–39. Алесь

## Рэдакцыі «Нашай Нівы»

У сувязі з надыходам халадоў Сабака і Граждан жадаюць упасьці ў сьпячку. Патрабую ад усіх эпігонаў пакінуць Граждана і Сабаку ў спакоі.

**Доктар Айбаліт**


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф–рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**.


Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а–112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2571. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 20.12.2006.

Замова № 7090.

Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.